Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Музычны Збуч ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

„Пінская шляхта" ☞ 3

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

№ 41 (2787) Год LIV | Беласток, 11 кастрычніка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Беларускія назвы ў Арлянскай гміне! Віншуем

30 верасня г.г. на сесіі арлянскай Гміннай рады радныя прынялі рашэнне ў справе ўсталявання дадатковых назваў мясцовасцей на мове беларускай нацыянальнай меншасці. Варта падкрэсліць, што гэты пункт парадку дня быў вынесены на разгляд — фармальна ад імя войта — сакратаром Гміннай управы Ірынай Адзіевіч у пачатку сесіі. Некалькімі днямі раней радныя коратка абмеркавалі гэтае пытанне на пасяджэннях сваіх камісій і рашылі паставіць кропку над і на найбліжэйшай сесіі. У час галасавання з ліку пятнаццаці прысутных радных „за" было дванаццаць, а траіх (двух з Орлі і адзін з Міклашоў) стрымаліся ад голасу. У зале панавала цішыня!

Раней, 12 лютага 2009 года, радныя прынялі пастанову пра ўвядзенне дапаможнай беларускай мовы. Пазней наш войт атрымаў з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ліст, у якім чытаем: Nawiązując do wniosku z dnia 14.04.2009 r. uprzejmie informuję, iż na podstawie art. 10 ust. 1 ustawy z dnia 6 stycznia 2005 r. o mniejszościach narodowych i etnicznych oraz języku regionalnym Gmina Orla została wpisana z dniem 7 maja 2009 r. do urzędowego rejestru gmin, w których używany jest język pomocniczy (Podpis z up. Sekretarza Stanu Tomasz Siemoniak).

Пасля сесіі папрасіў я старшыню Гміннай рады Аляксандра Кліна выказацца на гэты конт:

— Гэта паслядоўнасць першай пастановы, за якой трэба было прыняць і другую. Мы ў Еўропе і маем магчымасць пакарыстацца такім законам.

Намеснік старшыні Гміннай рады Антон Голуб сказаў:

— Сягаючы ў гісторыю, дык у Першай Рэчы Паспалітай былі польская дзяржава і Вялікае Княства Літоўскае, значыць Карона і Літва. І ў Вялікім Княстве Літоўскім дзяржаўнай мовай — побач літоўскай — была тая, на якой мы размаўляем сёння. Але час зрабіў сваё і тая наша мова ў польскай дзяржаве сталася ўжо мёртвай мовай; яна страціла статус дзяржаўнай мовы, наступіў застой і тая мова не атрымала нават статусу літаратурнай, беларускай ці ўкраінскай, асталася „тутэйшай", на якой мы і размаўляем — такое маё меркаванне. Мае дзеці размаўляюць „па-свойму" і ўсе бацькі павінны так вучыць сваіх дзяцей. Ведаю, што цяпер адбываюцца цікавыя змены, што ў горадзе дзеці пачынаюць гаварыць „па-свойму".

Войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвесюк сказаў:

— Арлянская гміна стала першай і адзінай не толькі ў Падляшскім ваяводстве, якая пакарысталася магчымасцю ўвядзення двухмоўных польска-беларускіх назваў мясцовасцей. І вельмі добра, што Рада за гэта прагаласавала (тыя траіх, якія стрымаліся, на камісіях быццам хацелі, каб Орлю пісаць „Вурля" — М. М.) Няма тут ніякіх падстаў для рознагалосся. Гэта запіс фактычнага стану, які тут маем — людзі размаўляюць так як размаўляюць, па-свойму; хопіць на вуліцы спытаць нейкага чалавека як ён вымаўляе назву данай мясцовасці.

Істотнае тое, што такая пастанова была прынята, што будзе можна прыняць такія меры (табліцы з назвамі — М. М.) Разглядаючы спектр цэлай краіны, наша пастанова падкрэслівае нашу адметнасць — канфесійную, культурную, моўную ды дае такі турыстычны крок уперад. Ужо сёння (на другі дзень пасля прыняцця пастановы — М. М.) было шмат мас-медыяў, званілі з Польскага радыё для замежжа, быў нават артыкул у газеце „Kurier Wileński". Гэта пайшло ў свет таму, што мы зрабілі гэта першымі сярод беларусаў у маштабе краіны.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Фотамантаж „Нівы"

Прапанаваныя назвы мясцовасцей на беларускай мове ў Арлянскай гміне:

Антоново, Бараноўцы, Волька, Волька-Выгаоўска, Грэдэлі, Дыдулі, Кошкі, Кошэлі, Круглэ, Крывятычы, Маліннікі-Колёнія, Міклашы, Москоўцы, Олекшы, Орля, Паўліново, Пашкоўшчына, Рудуты, Рыгороўцы, Спічкі, Топчыкалы, Чахі-Заболотны, Шчыты-Дзенцёлово, Шчыты-Новодворы і Шэрні.

Рэал-палітыка ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Яшчэ ў старым дзіцячым мульціку легендарны капітан Врунгель вымавіў мудрыя словы: „Як вы лодку назавеце, так яна і паплыве". І юныя гледачы адразу сталі сур'ёзна ставіцца да таго, як ім назваць той або іншы прадмет.

У назву людзі заўсёды стараліся ўкласці нейкае значэнне. Сачылі за тым, каб яна адпавядала ўнутранаму напаўненню. Прыкладам, імёны дзецям у нашай нацыянальнай традыцыі давалі такія ж, як у святых. Або як у продкаў гэтых дзяцей. Каб падкрэсліць, што гэтаму роду ёсць кім ганарыцца ў мінулым, і значыць, ёсць на што спадзявацца ў будучым...

Святочны колер Бушчыка ў Беластоку ☞ 4

Міра ЛУКША

Пажаданні

Усіх настаўнікаў віншуем з надыходзячым іхнім святам. Жадаем радасці і задавальнення ў штодзённай працы на асветнай ніве.

Рэдакцыя

ЗАПРАШАЕ

ПАГАВОРЫМ ПРА...
(ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ)

Месца сустрэч: Пачатковая школа нумар 4 Беласток вул. Чэнстахоўска, 6а, а гадз. 18⁰⁰

9 КАСТРЫЧНІКА 2009:
Пагаворым пра мастацтва
— сустрэча з Малгажатай Дмітрук, мастачкай, графікам.

Праект рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

Рэал-палітыка

Яшчэ ў старым дзіцячым мульціку легендарны капітан Врунгель вымавіў мудрыя словы: „Як вы лодку назавеце, так яна і паплыве". І юныя гледачы адразу сталі сур'ёзна ставіцца да таго, як ім назваць той або іншы прадмет.

У назву людзі заўсёды стараліся ўкласці нейкае значэнне. Сачылі за тым, каб яна адпавядала ўнутранаму напаўненню. Прыкладам, імёны дзецям у нашай нацыянальнай традыцыі давалі такія ж, як у святых. Або як у продкаў гэтых дзяцей. Каб падкрэсліць, што гэтаму роду ёсць кім ганарыцца ў мінулым, і значыць, ёсць на што спадзявацца ў будучым.

Нейкая логіка ў тым была. І нават зараз, калі нашчадкаў называюць імёнамі галівудскіх герояў або проста экзатычна прыгожымі словамі, знайсці ў тым нейкі ўнутраны сэнс можна. Прынамсі, прысутнічае ў тым працэсе любоў бацькоў, якія хочуць адпаведна свайго інтэлекту і ўласнага разумення жыцця абдарыць дзіця не толькі імем, але і яўным або патаемным значэннем, якое на іх думку тое імя нясе.

Назвы палітычных партый ад пачатку іх узнікнення таксама імкнуліся падкрэсліць ідэалогію і палітычныя прыярытэты. Калі мы чытаем „Кансерватыўная партыя", то адразу ведаем, чаго ад яе чакаць. Мы ўпэўненыя, што яна будзе паводзіць сябе не так, як ліберальная. І перакананыя, што хрысціянскія дэмакраты не будуць прапагандаваць марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Падводзячы вынікі, можна сказаць, што па назве мы адразу ведаем з якой палітычнай думкай і традыцыяй маем справу.

Але так было раней. Зараз свет звар'яцеў канчаткова. І назва партыі вам нічога не скажа, як назва нейкага прадукту, кшталту „Лясны пачастунак" вам не гарантуе таго, што ў ім будзе нешта з лесу. І справа нават не ў тым, што ёсць такія ад пачатку наўмысна размытыя назвы, якія не нясуць канкрэтнага напаўнення. Іх стваральнікі і самі не ведалі да якой яны ідэалогіі належаць і ўвогуле ці маюць хоць нейкую ідэалогію. Проста добра ўсведамлялі, што каб захаваць уладу, трэба мець сваю партыю. Таму і называлі свае дзеціішчы неканкрэтна. „Адзіная Расія", або „Партыя дабрабыту", або яшчэ як-небудзь абы як. Праблема ў тым, што на сённяшні дзень нават тыя партыі, у назве якіх закладзеная канкрэтная ідэалогія, больш не імкнуцца адпавядаць ёй.

Мяркуйце самі. Немцы зараз ламаюць галовы пра тое, каго ў Германіі прадстаўніца саюзу ХДС-ХСС (Хрысціянска-дэмакратычнага саюзу і Хрысціянска-сацыяльнага саюзу) Ангела Меркель прызначыць віцэ-канцлерам. Ці кандыдата ад сацыял-дэмакратаў ці адкрытага гея і ліберала Гідо Вестэрвелле, лідара Свабоднай дэмакратычнай партыі. Вось вам і правыя хрысціянскія дэмакраты.

Ці як вам такое — правы і надзвычай дэмакратычны Сільвіо Берлусконі, які ганарыцца сваёй правасцю і сваім дэмакратызмам, вельмі імкнецца пасябраваць з начальнікам беларускай краіны. Напэўна лічыць таго таксама дэмакратам. Ды што там Берлусконі. Такіх прыкладаў гульні ў „рэал-палітык" па ўсёй Еўропе безліч. Тая гульня дайшла ўжо і да Амерыкі.

Дык ці ёсць хоць які сэнс у тых партыйных назвах, праграмах, заявах, статутах, абяцаннях?.. І ці ёсць у гэтым палітычным свеце хоць у чым сэнс? І ці можна знайсці хоць адну прычыну таму ж самаму начальніку беларускай краіны датрымаць свайго слова перад Еўропай, калі ў самой Еўропе практычна не засталося анікога, хто б мог ацаніць па-сапраўднаму такі ўчынак.

І што чакаць на еўрапейскім і сусветным палітычным полі далей? Калі правыя або левыя (не мае зараз аніякага значэння), абы толькі здабыць галасы выбаршчыкаў могуць дамаўляцца са сваімі палітычнымі апанентамі на любых умовах. І якія пасля гэтага ў нас ёсць падставы меркаваць, што пасля здабыцця ўлады яны будуць прытрымлівацца сваёй ідэалогіі, або якіхсьці поглядаў, або хоць чаго-небудзь.

Хіба што трэба проста адважыцца і прызнаць той факт, што спадзявацца ў глабальным сусветным палітычным маштабе нам зараз няма на каго. Бо мы жывём у такі ўнікальны час, якога гісторыя палітычнага жыцця яшчэ не ведала. Гэта час рэал-палітыкі. Час такой палітыкі, якая спрыяе таму, каб на палітычным алімпе аказалася адразу ажно столькі шмат мудакоў.

Віктар САЗОНАЎ

Мы ў Еўрасаюзе

Сяляне, адкуль я памятаю, заўсёды наракалі. Яшчэ і цяпер хваляць геркаўскі перыяд, але тады таксама не былі рады. Мужык заўсёды быў незадаволены; магчыма, што такая чалавечая натура, што мы будзем наракаць з зайздрасці, бо іншыя маюць больш...

І прагне ўлады; вось прыклад з маёй Арлянскай гміны. Тут з санацыйнага часу на пасадзе начальніка ці войта не было нікога з самой Орлі, але амаль заўсёды з Бельска, якога карані найчасцей у заходняй частцы гміны. Тамашнія вяскоўцы не любяць арлянцаў і гміна здаўна неафіцыйна падзелена на дзве часткі: усход і „дзікі" захад, як гаворыцца ў народзе. Там перад выбарамі сяляне ўмеюць аб'яднацца і таму да гэтай пары правяць іхнія людзі. Прыкладам Міхал Іванчук, родам з Маліннік, які дагэтуль, будучы на пасадзе войта, найбольш зрабіў для Арлянскай гміны (пры ім былі пабудаваны асфальтавыя дарогі, водаправоды, школа, жылы блок, ачышчальня сцёкаў і распачата пракладка каналізацыі). Іванчук таксама выпіваў і таму Орля хацела яго адклікаць, аднак ён трымаўся моцна, бо яго выбаршчыкі баранілі рукамі і нагамі. Аднак надта цікавае тое, што тыя самі, што яго выбіралі і баранілі, зараз выказваюцца пра яго адмоўна. Вось калі Іванчука адклікалі, той набіраў спісак для падтрымкі рэферэндуму. Раней, калі ён будаваў дарогі, то быў такі дабрадушны, што некаторым хутаранскім сялянам вымасціў асфальтам дарогі пад самыя хаты, а пасля з жалем прызнаўся мне, што тыя самі сяляне не хацелі падтрымаць ягонай ініцыятывы. Відаць, сяляне любяць верхаводзіць і пасля наракаць; і заўсёды ім мала. Што жыццё на вёсках агульна палепшала — відаць простым вокам, напрыклад, на царкоўнай стаянцы край парку. Яна запоўнена іншамаркамі не толькі ў прыхадскія святы. Гадоў колькі раней стаяла там некалькі машын, найбольш польскіх „малюхаў", на якіх людзі прыязджалі памаліцца або толькі пастаяць каля храма. Хаця цяпер пад царкву прыязджае многа самаходаў, то перад царквой стаіць і шмат веласіпедаў — Арлянскі прыход даволі вялікі...

Зараз і пахаванні выглядаюць інакш, чым раней. Цяпер за труной ідзе толькі горстка людзей, найбліжэйшая сям'я, а апошнія едуць у машынах. Навошта хадзіць у абодва бакі (на могілкі і назад) пяшком, асабліва калі і надвор'е не спрыяе? Калі вядуць пакойніка з суседняй вёскі, то і ўсе едуць самаходамі, а яшчэ нядаўна, напрыклад з Міклашоў, людзі ішлі за труной (вядома, без бацюшкі, бо той раней выязджаў на машыне на могілкі). Сёння і пакойніка ніхто не нясе, толькі вязуць у катафалку. Матарызацыя ахапіла і вёскі, значыць людзі „разжыліся", як сказала мне адна жанчына, калі я спытаў яе пра карысць ад еўрасаюзных даплат. І хаця на від жывецца лепш, то людзі наракаюць, што горш. Памяняліся людзі і ва ўзаемаадносінах, і то ў адмоўным напрамку, бо большасць засяроджваецца толькі на сабе, а сем'і часта пасвараныя.

Далучэнне да Еўрасаюза прывяло да змяншэння ліку малых гаспадарак, а ў тых большых стала паяўляцца штораз магутнейшая тэхніка. І пры гэтай нагодзе таксама можна заўважыць цікавую змену. Раней уласнік новага трактара не афішываўся ім, але ехаў на ім у поле, а калі было трэба то такім проста ад работы прыязджаў у Орлю. А цяпер, калі селянін купіць новы магутны трактар, то прыязджае на чысцюткім ім у цэнтр Орлі і ставіць яго сярод самаходаў; такі трактар з велізарнымі коламі вельмі цікава там выглядае. Прахожыя задзіраюць галовы, а трактарыст — ці мо яго трэба неяк інакш называць — афішыруецца перад імі манеўраваннем сваёй машынай...

Але да еўрасаюзнай культуры яшчэ ў нас далекавата. Здаралася ўжо, што на такія вялікія машыны скардзіліся жыхаркі некаторых вёсак, бо калі яна выедзе з поля, набраўшы там у пратэктары балота, на вясковай вуліцы паскарае і распырсквае тое балота па вокнах. Тут трэба патлумачыць, што ў некаторых еўрасаюзных краінах трактарыст перад выездам з поля на дарогу мае абавязак пачысціць свой трактар. Калі аднойчы я, як радны, вынес гэтую справу на адной з камісій, то радныя-мужыкі сталі смяяцца, а адна жанчына нават спытала: «То і „бліны" ад кароў таксама трэба будзе прыбіраць?» А вось і трэба ведаць, што закон патрабуе прыбіраць такія „аздобы".

Міхал МІНЦЭВІЧ

Вачыма еўрапейца

Небяспечны пройгрышны?

Яшчэ пры канцы вясны, калі можна было ўжо быць упэўненым, што Владзімеж Цімашэвіч будзе змагацца з былым нарвежскім прэм'ерам Турб'ёрнам Ягландам за крэсла старшыні Рады Еўропы, выслаў я яму мейлам пару пытанняў. Распытваў яго, якія найважнейшыя заданні ў найбліжэйшыя гады будуць ставіцца перад РЕ і як ён ацэньвае яе заданні пасля пашырэння на іншыя краіны з'яднанай Еўропы. Прасіў, каб разгарнуў думку, што РЕ трэба „надаць новы імпульс" і быў цікавы, якія канкрэтныя ўмовы мусіць выканаць Беларусь, каб стаць паўнапраўным членам Рады. На жаль, незалежна ад таго, што я яму яшчэ неаднойчы прыпамінаўся, адказу не атрымаў; не атрымалі яго чытачы „Нівы". Прыгадаю, што канчаткова былы прэм'ер Польшчы прайграў з нарвежцам ды і пры вялікай розніцы галасоў (165:80). Такія былі вынікі галасавання, хаця — як сцвердзіў зараз пасля выбараў у аэрапорце ў Варшаве сам Владзімеж Цімашэвіч — „урад зрабіў вельмі шмат", а „прэм'ер і дыпламатыя былі вельмі актыўныя".

Старт і паразу Владзімежа Цімашэвіча ахвотна каментавалі палітыкі розных спектраў. Прытым у прынцыпе гаварылі аб тым, як паводзілі сябе ў стараннях за гэтую пасаду для паляка польскія ўрад і дыпламатыя, а не аб тым, што меў у прапанове сам кандыдат, а ад чаго адмовіліся еўрапейцы.

— У час свайго хадайніцтва за галасы на форуме Рады Еўропы пан прафесар Цімашэвіч адрэкамендаваў не толькі кампетэнтную і добрую праграму рэформы, але паказаўся таксама як палітык еўрапейскага маштабу, — так досыць агульна тлумачыў віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў, шэф падляшскай ГП Роберт Тышкевіч.

Шукаў я ў інтэрнэце праграму рэформаў, з якой стартаваў Цімашэвіч. На ягоных вэб-старонках знайшоў ліст членам Парламенцкай асамблеі Рады. Прачытыў, што запрапанаваў „праграму, якая можа здацца быць вельмі амбітнай" і „Рада Еўропы не можа быць заменена якой-небудзь іншай міжнароднай арганізацыяй". І так далей у падобным тоне: „Паколькі кожная Арганізацыя патрабуе пастаяннага прыстасоўвання да новых выклікаў, пэўныя рэформы неабходныя. Усе часткі Арганізацыі павінны быць уключаны ў гэты працэс рэформаў, апіраючыся на кансэнсус". І так больш-менш столькі. Натрапіў я таксама на выказванне Цімашэвіча, змешчанае на адным з беларускіх сайтаў, дзе заявіў ён, што ўлады ў Мінску павінны ўзмоцніць намаганні па прыняцці Беларусі ў Раду Еўропы (каб стаць паўнапраўным членам Рады, мусіць яна, напрыклад, увесці мемарандум на выконванне смяротнага пакарання). Сказаў яшчэ, што падтрымліванне кантактаў з Беларуссю „стане эфектыўным інструментам націску на тамашнія ўлады, каб тыя прынялі на сябе еўрапейскія абавязкі".

Нічога таму практычна не ведаю, што такім чынам Владзімеж Цімашэвіч меў запрапанаваць РЕ. Клапатлівая журналістка адной з агульнапольскіх тэлестанцый у паслявыбарчы ранак перажывала: „Як ён агорае пройгрыш?"

Наколькі памятаю, Владзімеж Цімашэвіч пасля розных пройгрышаў даваў сабе рады; мабыць, спакой дому ў Белавежскай пушчы яму ў гэтым памагаў. Некалькі дзён таму ён прадказваў, што вернецца цяпер да ўніверсітэцкіх дакладаў і сенатарскай працы (з'яўляецца незалежным падляшскім сенатарам). Тым часам па палітыках галоўнай кіруючай партыі відаць, што ім не вельмі даспадобы ягоная прысутнасць на польскай палітычнай сцэне, а ўжо небяспека пагражае Дональду Туску, — калі б Цімашэвіч выстартаваў у прэзідэнцкіх выбарах праз год. Таму не здзівіла мяне заява цяперашняга прэм'ера:

— Можа ён адыграць шмат цікавых роляў у палітыцы, асабліва міжнароднай.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„Пінская шляхта” на Беласточчыне

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Залы гайнаўскага і бельскага дамоў культуры ды беластоцкага Драмтэатра імя Аляксандра Вянгеркі запоўніліся гледачамі, у большай частцы моладдзю, у час выступленняў 2, 3 і 4 кастрычніка г.г. Палескага драматычнага тэатра з Пінска. Гледачы ўслухоўваліся ў палешуцкую мову драмы класіка беларускай літаратуры Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Спектакль гэтага наймалодшага прафесійнага тэатра ў Беларусі (узнік ён у 2006 годзе і на Беласточчыне першы раз выступаў за мяжой) быў паказаны дзякуючы стараням Музея малой айчыны ў Студзіводах і яго шэфа Дарафея Фіёніка, пры саўдзеле Культурнага цэнтра Беларусі і Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку, у рамках праекта папулярызуючага творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча (1808-1884), а дафінансоўванага Міністэрствам унутраных спраў і адміністрацыі.

— Гэта была мая ідэя, каб запрасіць гэты тэатр, — прызнаўся „Ніве” Дарафей Фіёнік. — Сёлета наш падляшска-палескі фестываль „Там по маёвуй росі” мае вельмі шырокую формулу. Такім моцным акордам канчае яе таксама прэзентацыя гэтага тэатра. Не ўзнікла б яна без палешука Івана Базана, які ў яго стварэнне ўклаў усю душу. У тэатральнай частцы фестывалю не было нічога лепшага для паказання з Палесся, чым „Пінская шляхта”.

„Пінская шляхта” гэта першая беларуская камедыя, якая ўзнікла найбольш праўдападобна ў 1866 г., падобна што пад уплывам горычы аўтара ад вынікаў паўстання 1863 г. і царскіх рэформ 1861 г. З’яўляецца мяшанкай фарса і вадевіля. Любоўны матыў паміж „думаючымі сэрцам” 17-гадовай Марысяй (Вольга Ермалаева) і маладым Грышкам (Павел Рыжоў) ды стараючымся за яе руку стараватым, але „бывалым у свеце” і „пісьменным”, пазбаўленым пачуцця гумару шасцідзесяцігадовым Харытонам Кутаргай (Аляксандр Белавус) упісваецца ў інтрыгу, пабудаваную вакол канфлікту паміж бацькамі маладых — упарта спасылаючыхся на шляхецтва, проста хварэючымі ім у глухой ваколіцы вакол палескіх балот, гэтак званымі „жыццёва мудрымі”: Ціхонам Пратасавіцкім (Іван Базін) і Іванам Цюхай-Ліпскім (Андрэй Дмітрычэнка). Цэнтральнай фігурай п’есы з’яўляецца аднак постаць прадстаўніка царскага суда ніжэйшай інстанцыі, „Найяснейшай кароны” — тупога невука і хабарніка Кручкова (Аляксандр Горак). У адным з куплетаў спявае пра яго Кутарга: „Дзе ўнадзіцца юрыста, вымеце хату дачыста”. Аляксандр Горак адыграў гэтага героя мабыць так як хацеў бы гэтага Дунін-Марцінкевіч — вельмі смешна, асабліва ў сцэнах, калі кожны з бакоў працэсу паміж Ліпскім і — празваным ім зняважліва „мужыком” — Пратасавіцкім мусіць плаціць кару (нават тыя, што бачылі драку і нічога не зрабілі, каб прадухіліць яе). Шмат уцехі выклікала ў гледачоў на Беласточчыне сцэна, калі Кручкову блытаюцца даты і царскія ўказы, быццам не ведаў, на якім свеце жыве.

— Кручкоў гэта ўлада. І цяпер кажуць, што трэба тое ці тое, а мы мусім гэтаму падпарадкавацца, — гаварыў „Ніве” рэжысёр і дырэктар тэатра Іван Базан. — Былі пастаноўкі „Пінскай шляхты”, напрыклад, у Купалаўскім тэатры, дзе ставіліся акцэнты на канфлікт з дзяржавай, а мы стараліся засяродзіцца на этнічнасці драмы, палешуцкасці тадышніх часоў. Не ставім адназначных акцэнтаў на нейкі матыў. Гледачы і так зразумеюць сваё. Было хабарніцтва, такі хабарнік Кручкоў недзе дзесьці там ёсць, і сёння трапляюцца такія людзі.

П’еса ў няпоўную гадзіну канчае сцэна, якой няма ў драме Дуніна-Марцінкевіча. На падмостках паяўляецца нямы пастушок. Не разумее толькі што адбыўшайся, недарэчнай сітуацыі.

— Хоча выказаць супраціў: як можна ручнік кінуць на зямлю, каб валяўся? Дзе святасць, чысціня? Але пастушок нічога не можа сказаць. Дарэчы, ёсць нейкі сэнс у сказе Кутаргі: „На тое Бог даў людзям язык, каб умець маўчаць”, — тлумачыў пасля нам Іван Базан.

Яго жонка, адказная ў Палескім тэатры за літаратурны бок п’ес, Таццяна Базан дадала:

— Юрыст, як дойдзе да ўлады, дык толькі шукае, каб дарвацца да грошай. Заўсёды былі несумленныя людзі, а пакутавалі з-за іх простыя людзі.

Сцэнічнае афармленне ў Гайнаўцы, Беластоку і Бельску было сціплае, але ў сваёй скромнасці нейкім чынам спасылалася на тэатральную традыцыю XIX-вечнага правінцыйнага тэатра. Дзве карціны завешаныя на гарызонце сцэны з відам вясковы хат, на сцэне дзве лавы і тры столкі, дзве жардзіны ў загарадзі, за імі дзесятак збожжа. У Пінску сцэнічнае афармленне больш багатае. Тут і там увагу прываблівацьць касцюмы, амаль перфектныя ў палешуцкіх дэталях. Сам Палескі драматычны тэатр нарадзіўся з аматарскага тэатра, пасля ператворанага ў прафесійны — студыйны. Ад трох гадоў ён поўнасцю прафесійны, размяшчаецца ў былым кінатэатры (118 месц у глядзельнай зале) у цэнтры Пінска, горада з больш за 130 тысячамі жыхароў. Займаецца ў ім васемнаццаць акцёраў, большасць якіх зайграла ў „Пінскай шляхце”.

— Горад фінансуе нам штаты. На аплаты звязаныя з утрыманнем сядзібы, сцэнічнае афармленне, шыццё касцюмаў зарабляем самі. Даем аж дзевяць прэм’ер на працягу года, — сказала нам Таццяна Базан.

Дадала:

— Мы якраз паставілі „Пінскую шляхту”, бо яна найбольш блізкая душы нашага беларускага пінскага народу.

Іван Базан:

— Паколькі мы таксама і з назвы палескі тэатр, палічылі, што мы павінын мець такую палескую візітную картачку, а ёй якраз з’яўляецца „Пінская шляхта”. Паставілі мы яе два гады таму з нагоды двухсотгоддзя з дня нараджэння аўтара.

На прадстаўленнях быў Язэп Янушкевіч з Ракава, даследчык беларускай літаратуры і адкрывальнік таксама творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які прывёз для гледачоў арыгінальны тэкст п’есы з уласным польскамоўным апісаннем, выдадзены сёлета ў Мінску. Пасля спектакля спытаўся ў нас: „Ну і як спектакль?” Пачуўшы адказ, што найважнейшая была мова драмы і ідэя аўтара, адказаў толькі: „Ну вось!”

У апісанні драмы Янушкевіч сцвердзіў: „Апрача праблемы непісьменнасці, запалохвання, ганарлівасці, напыхлівасці, самадурства — усяго, што можна апісаць пры дапамозе аднаго паняцця „дэградацыі” мясцовай шляхты, а таксама апрача шматкроць прыводжанай у літаратурных творах тэмы карупцыі нехаўшых „паляўнічых” на штораз вышэйшых рангах чыноўніцкай іерархіі — аўтар камедыі ў „Пінскай шляхце” крануў яшчэ адну з’яву — правакацыі, якую прымяняла расійская бюракратыя”.

„Пінская шляхта”, якую з-за цэнзуры апублікавалі ажно ў 1918 годзе, але ўжо ў апрацоўцы. У арыгінале якраз, дзякучы стараннем Язэпа Янушкевіча, паказалася яна ў... 1984 годзе.

— Кручкоў гэта ўлада. І цяпер кажуць, што трэба тое ці тое, а мы мусім гэтаму падпарадкавацца, — гаварыў „Ніве” рэжысёр і дырэктар тэатра Іван Базан (стаіць другі справа).

Публіка запаўняла залу намнога раней да распачацця спектакля

Урэшце дачакаліся!..

Кашмарам для кузаўцаў, як і чарамшан, з'яўлялася вуліца Вонскатаровая ў пасёлку, якая спалучае чыгуначную станцыю з Кузавай, г.зв. „Вузкакалейка". Праблему стварала калдобістая гравейка. Праўда, у Кузаву ці над Рэпчыцкі вадаём можна даехаць навокал асфальтаванай дарогай побач даўнейшага паравознага дэпо (вуліцы: Каляёва і частка Вішнёвай), але гэта многім карыстальнікам дарог з'яўлялася лішняй валакітай. Варта адзначыць, што ў час асфальтавання кузаўскай вуліцы сяляне ўспамаглі гміну грашовай складчынай, якая мела быць прызначана на асфальтаванне „Вузкакалейкі". Але тады кузаўцаў абулі ў лапці, паколькі асфальтавалі адрэзак Вішнёвай у напрамку паравознага дэпо. Гміна тлумачыла, што „Вузкакалейку" нельга мадэрні-

Фота аўтара

Мадэрнізаваная вуліца Вонскатаровая

заваць, паколькі яна з'яўляецца ўласнасцю чыгункі. Справа доўжылася больш пяці гадоў і столькі ж выносілася на вясковых сходах кузаўскага салэцтва. У час апошняй самаўрадавай выбарчай кампаніі павятовы радны Мікалай Міхалюк абяцаў, што вырашыць праблему „Вузкакалейкі", за што атрымаў падтрымку маіх аднавяскоўцаў. І слова стрымаў. Павятовае староства прызначыла неабходныя сродкі на інвестыцыю і ў пачатках верасня вуліцу Вонскатаровую мадэрнізавалі. Хоць не паклалі тут традыцыйнага асфальту, адно бітумічную масу, але дзякуй і за гэта. Каб усе чаромхаўскія жвіраваныя вуліцы так мадэрнізавалі, быў бы сапраўдны „люксус"!

Уладзімір СІДАРУК

Лагічная прапанова

У парламент паступіў урадавы законапраект, які прадугледжвае, што п'яныя шафёры будуць прыгаворвацца да прымусовай грамадскай працы. Дагэтуль суд абмяжоўваўся адно да штрафаў і пазбаўлення вадзіцельскіх правоў. Паводле законапраекта шафёры-злачынцы будуць у абавязковым парадку карацца прымусовай грамадскай працай і абмежаваннем свабоды. Кошт арганізавання публічных работ будзе несці дзяржава, а не, як дагэтуль, самаўрад. Па ацэнцы ведамства справядлівасці, для гэтакай здзелкі спатрэбіцца каля 20 мільёнаў злотых у год, але чыноўнікі кажуць, што нягледзячы на бюджэтную дзірку, грошы на гэтую мэту знойдуцца. Памойму гэта лагічная прапанова, каб толькі хутчэй была яна адобрана парламентам.

(ус)

Святочны колер Бушчыка ў Беластоку

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Выставачныя залы Культурнага цэнтра Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь — адзінага такога культурнага цэнтра апекаванага замежнай дыпламатыяй, які не размешчаны ў сталіцы — адкрыліся ў гэты раз на палотны Міколы Бушчыка, аднаго з самых вядомых і яркіх сучасных беларускіх мастакоў сярэдняга пакалення. Выстава адкрылася 1 кастрычніка і можна наведаць яе кожны будні дзень да канца месяца.

Злева: Святлана Бушчык, Мікалай Бушчык, Аляксандр Карачун

— Сёння мы адкрываем выстаўку Міколы Бушчыка, — запрапанаваў дырэктар КЦБ Аляксандр Карачун. — Гэта творца душы і сэрца. З кожнай выставай адбываецца свята ў душы мастака. Сустрэча гледача з яго творамі гэта сапраўдная таямніца. Таму што адбываюцца пералівы душы з душы мастка ў душу гледача. Сэрца, душа і подых творчасці Мікаля Бушчыка — у яго працах. Ягоныя працы ведаюць і ў Злучаных Штатах, і ў Францыі, і ў Галадныі, Германіі, Іспаніі, Італіі, Канадзе, на Украіне, і ў Расіі, і ў роднай Беларусі...

— Для мне вельмі пашанотна прадставіць свае карціны такім людзям, якія трымаюць сваю культуру, мову, звычаі, — мастак быў рады бачыць зацікаўленне ягонымі працамі беларусаў Беласточчыны.

Мікалай Бушчык нарадзіўся ў вёсцы Дзераўная Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў 1948 годзе. Закончыў Краснадарскае мастацкае вучылішча (Расія) і Беларускую акадэмію мастацтваў у Мінску. Удзельнічаў у больш за 170 рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных калектыўных і персанальных выстаўках. Піша пра яго прафесар Уладзімір Растаўцоў: „Я ведаю Міколу больш за 30 гадоў. І за гэты час меў магчымасць упэўніцца, які гэта глыбінны чалавек, філосаф. Ён мае некалькі дзівосных талентаў, і першы з іх, лічу, — гэта талент каларыста, талент адчування колеру. Другі — талент адчування прасторы. У Бушчыка ёсць яшчэ значная сфера прымянення яго таленту, але яе ён ніяк не афішыруе. А ўсё таму, што мае яшчэ адзін талент — сціпласць..." — „Ён думае выключна колерам! Любая эмоцыя, любая з'ява прыроды ўспрымаецца ім як колер з яго варыяцыямі. Ягоныя ўражанні — ад рэальнага жыцця, а ягонае ўспрыманне прыроды — на фоне ўражанняў вандроўцы. Яго праца — пейзаж, які высілкам індывідуальнасці і таленту майстра перамяняецца ў такую буйную стыхію колеру, якой у беларускім жывапісе практычна няма!" — гэта думка Вольгі Архіпавай, якой следам пойдуць тыя, хто ўбачыць яркія палотны і лісты прац Бушчыка. Свае меркаванні пра свет мастак пераносіць на палатно, карыстаючыся простымі і даступнымі сродкамі — колерам, лініяй, плоскацю.

— Колер гэта галоўная мова жывапісу... У творчасці я жадаў бы сцвярджаць прыгажосць, чысціню раніцы і вечара, тварэнні летняга ліўня або выдатнага зімовага снегападу, — раздумвае мастак. — У сваіх працах імкнуся да таго, што ў выніку створыць адчуванне радасці і нейкага гарманізаванага супакою, настрою, які прыводзіць чалавека ў добрую, жыццесцвярджальную гармонію.... Мастак шукае рытмамі, колеранапружаннем такія станы на палатне, якія прымушаюць хвалявацца. Вядома, шматлікае адбываецца на ўзроўні падсвядомасці, асацыятыўнасці, паколькі мастак з мноства бачнага выбірае самае актыўнае і характэрнае; тое, што выяўляе пачуццё або эмоцыю... Адна эмоцыя мае ў мяне адзін колер, другая — другі, трэцяя — трэці. У спалучэнні, у рытмах, яны складаюцца ў карціну.... Мне цікавы жывапіс як неабмежаванае мастацтва. Яно блізкае людзям па-за межамі іх моў, назалежна ад колеру іх скуры і палітычных рацый. Мастацтва павінна быць зразумелым без перакладчыка...

Бушчыка можна гадзінамі глядзець... і слухаць. Выяўляць асацыяцыі з музыкай, з гукамі, з эмоцыямі. І слухаць ягоных беларускіх аповедаў аб найкаляровай Беларусі.

— Чырвань, золата, блакіт гэта ўсё, што вызначае стан душы маёй краіны. Нідзе я не бачыў столькі вясёлак, як у Беларусі...

І пачнецца аповед пра Слонімшчыну, пра Дзераўную, пра курганы і яры за вёскай... Мушу прызнацца, што ўжо само слуханне Міколы Бушчыка ў маёй душы вызваляе пачуццё свабоды, глыбокага сузірання гожасці сусвету, трапяткога адчування Айчыны, роднага.

Карціны Міколы Бушчыка трэба глядзець без мітусні, сузіраючы, так як і тварыліся яны — мастаком „які глядзіць на свет вачыма Усявышняга", паўтарае момант стварання свету. Такі чалавек павінен быць чыстым, гатовым несці свята ў сябе.

Прафесар Галіна Твярановіч (другая справа) у сяброўскай размове з мастаком

Мастак з'яўляецца шматгадовым чытачом нашай газеты, таму і завітаў да нас у госці

Дваццацігадовы шлях семінарыі ў Жыровічах

Віктар Садкоўскі — першы рэктар Мінскай духоўнай семінарыі ў Жыровічах

Мінская духоўная семінарыя — адна са старэйшых навучальных устаноў у Беларусі, якая дзейнічае ў Жыровічах да сённяшніх дзён. Яна пачала свой гістарычны шлях роўна 224 гады таму. А сёлета 16 верасня споўнілася 20 гадоў з той пары, калі семінарыя ў Жыровічах адрадзілася другі раз.

У сувязі з 20-годдзем Мінскай духоўнай семінарыі ў Жыровічах, наш карэспандэнт задаў некалькі пытанняў прафесару семінарыі Віталю Антоніку.

— Спадар Віталь, нагадайце, калі ласка, нам гістарычны шлях Мінскай духоўнай семінарыі.

— Гісторыя стварэння вышэйшай навучальнай установы Беларускай праваслаўнай царквы — Мінскай вышэйшай духоўнай семінарыі — бярэ свой пачатак у канцы XVIII стагоддзя, калі 15 мая 1785 года імператрыца Кацярына II загадала заснаваць у Слуцку пры праваслаўным епіскапе Віктару (Садкоўскім) семінарыю. Гэты загад з'явіўся вынікам пагаднення паміж Польшчай і Расіяй аб аднаўленні ў межах Рэчы Паспалітай праваслаўнай епіскапскай кафедры і меў на мэце паляпшэнне адукацыі праваслаўных на гэтых землях. 15 верасня 1785 года „Набожная Слуцкая праасвяшчэннага Віктара Садкоўскага семінарыя" была адкрыта.

— І хто былі яе першымі вучнямі?

— Першымі вучнямі яе сталі дзеці свяшчэннаслужыцеляў з блізкіх да Слуцка мясцін. Напачатку ў семінарыі дзейнічалі два класы: ніжэйшы і вышэйшы, у якіх навучалася 25 чалавек. У 1789 годзе польскія ўлады арыштавалі праасвяшчэннага Віктара. Семінарыя была закрыта і зноў пачала сваю дзейнасць толькі ў студзені 1793 года спачатку пад сваёй папярэдняй назвай, а пасля стварэння Мінскай губерні і Мінскай епархіі была перайменавана ў Мінскую. Пераемнікам праасвяшчэннага Віктара стаў праасвяшчэнны Іоў (Пацёмкін). Ён пераўтварыў Мінскую семінарыю ў васьмігадовую навучальную ўстанову як і іншыя вялікарасійскія семінарыі. Былі адкрыты вышэйшыя класы — філасофскі і багаслоўскі. Павялічылася колькасць выхаванцаў і выкладчыкаў. Пачатую з поспехам праасвяшчэнным Іовам справу прадоўжыў яго пераемнік архіепіскап Серафім, які паставіў перад сабой мэту: узвесці семінарыю на вышэйшую ступень дасканаласці, але надышоў 1812 год і семінарыя зноў спыніла сваю дзейнасць.

— І другі яе перыяд пачаўся ўжо пасля вайны 1812 года. Так?

— Так. У 1816 годзе семінарыя была падзелена на тры навучальныя ўстановы: прыходскае і павятовае вучылішчы і ўласна семінарыю, якая пачала працаваць па новых навучальных планах, а ў 1840 годзе была пераведзена ў Мінск і стала Мінскай не толькі па тытуле епархіі, але і па месцы свайго знаходжання. У курс навучання былі ўведзены новыя прадметы — медыцына, прыродазнаўства, сельская гаспадарка. Агранамічныя навукі выкладаліся не толькі ў тэорыі, але і на практыцы. Важнае месца адводзілася ў семінарыі і вывучэнню гісторыі роднага краю. У 1848 годзе семінарыяй быў выдадзены збор старажытных грамат і актаў гарадоў, манастыроў і цэркваў Мінскай губерні. У 1864 годзе было выдадзена „Гісторыка-статыстычнае апісанне Мінскай епархіі", складзенае рэктарам семінарыі архімандрытам Мікалаем. Выкладчыкі Мінскай духоўнай семінарыі былі высокаадукаванымі людзьмі, мелі вучоныя ступені і навуковыя працы. Праславілі гэтую навучальную ўстанову і яе шматлікія выхаванцы: гісторыкі XIX стагоддзя У.З. Завітневіч і І.І. Малышэўскі, прафесар Пецярбургскай ваенна-медыцынскай акадэміі Ф.І. Пастарнацкі, дыпламат І.А. Гашкевіч і іншыя.

— Але дзейнасць семінарыі зноў была спынена ў 1918 годзе...

— Дзейнасць Мінскай духоўнай семінарыі сапраўды была спынена ў 1918 годзе. Толькі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў 1945 годзе ўлады далі згоду на адкрыццё ў Жыровіцкім Свята-Успенскім мужчынскім манастыры пастырска-багаслоўскіх курсаў, кіраўніцтва якімі было даручана ігумену Лявонцію (Бондару). У 1947 годзе курсы пераўтварылі ў семінарыю, якую ўзначаліў архімандрыт Мітрафан (Гутоўскі), намеснік Жыровіцкага манастыра. Быў пабудаваны асобны будынак для навучэнцаў і кіраўніцтва семінарыі, але ўмовы яе існавання былі складанымі, і ў 1963 годзе семінарыю зноў закрылі. Толькі ў канцы васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, калі адбыўся перагляд дзяржаўнай палітыкі адносна Праваслаўнай царквы, дзейнасць семінарыі была адноўлена. У 1989 годзе па ініцыятыве цяперашняга Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта (Вахрамеева) Мінская духоўная семінарыя зноў адкрылася ў Жыровіцкім манастыры. Рэктарам яе стаў намеснік манастыра архімандрыт Стэфан (Корзун). У 1991 годзе семінарыя атрымала статус вышэйшай навучальнай установы з пяцігадовым тэрмінам навучання. Яе ўзначальвае сёння архімандрыт Іоасаф (Морза).

— Каго рыхтуе сёння Мінская духоўная семінарыя ў Жыровічах?

— Семінарыя рыхтуе свяшчэннаслужыцеляў і царкоўных служак Беларускай праваслаўнай царквы. Выкладаюцца багаслоўскія, філасофскія, філалагічныя, гістарычныя, царкоўна-прыкладныя дысцыпліны. Лекцыі ў семінарыі чытаюць спецыялісты з сусветнавядомымі імёнамі. Студэнты пасля абароны дыпломных прац атрымліваюць ступень бакалаўра. Лепшых пасылаюць на стажыроўку ў прэстыжныя заходнія багаслоўскія навучальныя ўстановы. Пры семінарыі дзейнічае нядзельная школа, у якой выкладаюць студэнты семінарыі. Адкрыта рэгенцкае аддзяленне, дзе заняткі вядуць вядомыя спецыялісты ў галіне музыкі. На базе рэгенцкага аддзялення семінарыі створаны змешаны хор. Хор прымаў удзел у многіх беларускіх і замежных канферэнцыях, канцэртах, сустрэчах, у тым ліку ў Гайнаўцы (Польшча) і ў Германіі.

— Ці займаецца семінарыя выдавецкай дзейнасцю?

— Так. Выдаецца студэнцкі часопіс „Ступені", навукова-багаслоўскі зборнік „Працы Мінскай духоўнай акадэміі", зборнік прац студэнтаў „Экспромт", „Студэнцкі альманах" і іншыя выданні.

— У Жыровічах месціцца не толькі семінарыя, але і Мінская духоўная акадэмія. Ходзяць чуткі, што акадэмію плануюць перавесці ў Мінск. Ці праўда?

— У перспектыве плануецца перавесці Мінскую духоўную акадэмію ў Мінск, а семінарыя застанецца ў Жыровічах.

Сяргей ЧЫГРЫН

Мінская духоўная семінарыя ў Жыровічах

Адкрыццё Мінскай духоўнай семінарыі ў Жыровічах у 1989 г.

Старое Ляўкова

Пенсіянеры гуляюць

У суботу 19 верасня г.г. у самаўрадавай святліцы ў Старым Ляўкове Гайнаўскага павета адбылося культурна-забаўляльнае мерапрыемства для пенсіянераў з амаль усёй Нараўчанскай гміны. Сабралася на ім сто чалавек. Удзельнічалі ў ім таксама войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч ды старшыня Акруговага праўлення Польскага саюза пенсіянераў (ПСП) у Беластоку Ян Каліноўскі. Сустрэчу вяла старшыня Гміннага праўлення ПСП у Нараўцы Ядвіга Карпюк.

Быў пачастунак і пачаліся танцы. Іграў Пётр Скепка, спявала Анна Карэтка. Плылі беларускія, украінскія, рускія і польскія песні. У перапынках паміж танцамі спадарыня Ядвіга праводзіла конкурсы, у тым ліку песенны „Мікрафон для ўсіх". Вельмі прыгожа і з вялікім пачуццём спявалі таксама Вольга Сачко, Яўгенія Вярбіцкая і Ядвіга Самоцік ды Мікалай Варанецкі. Усе спевакі-аматары атрымалі рэчавыя ўзнагароды. Была яшчэ і рэчавая латарэя.

Суботні вечар прайшоў для ўсіх у прыемнай ды сардэчнай атмасферы. Цікавейшыя ўрыўкі з вечарыны зняў на камеру Юрый Равінскі. Кінафільм застанецца для памяці ў гміннай фільматэцы.

Варта дадаць, што неўзабаве адбудзецца другое такога роду мерапрыемства з нагоды Дня сеніёра. Будзе гэта 18 кастрынічка г.г. у рэстаране ў Нараўцы.

Нараўчанская гміна

Новая маставая ў Капітаншчыну

Як Капітаншчына Капітаншчынай, гэтая вёска ніколі дагэтуль не мела асфальтавай вуліцы, а зараз мае! Капітаншчына гэта прыпушчанскае сяло ў Нараўчанскай гміне Гайнаўскага павета. Ад Старога Ляўкова вяла да яго ўхабістая дарога. А вось ужо сёлета ў верасні паклалі асфальт ад моста цераз раку Нараўку да вёскі ды праз усё сяло. Будзе гэта 1,2-кіламетровы адрэзак гэтай павятовай дарогі. Асфальт паклала рабочая брыгада Павятовага праўлення дарог у Гайнаўцы.

Пра новую маставую на гэтай дарозе найбольш паклапаціўся радны і заадно старшыня Гмінай рады ў Нараўцы Андрэй Мядзведзь. Па ініцыятыве яго ды іншых радных у мінулым годзе паклалі асфальт па гравейцы ад расходных дарог у Падляўкове ў канец вёскі Ахрымы. Гэта ў два разы большы адрэзак чымсьці пабудаваны сёлета ў Капітаншчыну.

Рады гэтаму ўсе, не толькі жыхары Капітаншчыны, Падляўкова ці Ахрымоў. Усе ж зараз тут ездзяць па роўных як стол маставых міжвясковых дарог.

Мне, супрацоўніку „Нівы", хацелася б часцей пісаць пра такія новыя маставыя на дарогах Нараўчанскай гміны. А факт першай асфальтавай маставой на вуліцы ў Капітаншчыне ўжо ўпісваецца ў гісторыю гэтай прызабытай вёскі, якая адным сваім канцом упіраецца ў Белавежскую пушчу.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Ваяўнічыя перапынкі з дзяўчынкамі!

Звычайна, пасля гадоў, мы здзіўляемся: як гэта магчыма? Як гэта магчыма, што ў нас была вайна з сяброўкамі? Так, у пачатковых класах хлопцы дакучаюць дзяўчаткам. Тузаюць іх за валасы, тоўкаюць локцямі, кажуць ім непрыемныя словы. Дзяўчаты плачуць, ідуць са скаргай да сваёй выхавацелькі. А калі гэта не памагае, класных „ворагаў" адпраўляюць на размову да пані педагог! Пасля ўсё добра. Усе сабе прабачаюць. Гуляюць. Смяюцца.

Вось і знаёмства ў чацвёртым „а" класе адбылося паводле падобнага сцэнарыя. Хоць у пачатку былі слёзы і плач, дзеці адразу змірыліся. Хлопчык папрасіў прабачэння ў дзяўчынкі. Пры цэлым класе і „Зорцы" ён паабяцаў быць ветлівым. Ну, цікава як доўга будзе стрыманае абяцанне?!

Пасля некалькіх хвілін мы зразумелі прычыну частых непаладкаў у класе. Тут амаль усе дзеці любяць музыку. А як вядома, для гэтага патрэбны тэмперамент. Вучні чацвёртага „а" любяць выступаць з беларускімі вершамі. Вось з ліку дэкламатараў нашы сябры вылучылі Крыстыяна Цэтру і Мартыну Янкоўскую. Наталька Шацілоўская ў сваю чаргу распавяла пра свае любімыя кніжкі. Дзяўчынка, аказалася, любіць кніжкі на беларускай мове. Мы нагадалі пра беларускі літаратурны конкурс для школьнікаў і падказалі, што тэмы для іхніх апавяданняў і вершыкаў валяюцца „на перапынках". Дастаткова апісаць іх вайну паміж хлопцамі і дзяўчатамі! Такая вайна, хоць сама па сабе выціскае слёзы, пажаданая. Калі падрасцем, мы глядзім на яе з сімпатыяй. І часта з той самай дзяўчынкай дамаўляемся пайсці ў кіно або парк збіраць каштаны.

У чацвёртым „а" класе, што ў бельскай „тройцы", дваццаць вучняў. Выхавацелем класа з'яўляецца Андрэй Вышкоўскі.

ЗОРКА
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Алесь ЧОБАТ

Кастрычнік

час пагас як агонь попел стыне
па кастрычніку прыйдзе пустыня
задрамаў навек як спамін
на суку чорны воран адзін
і адзін чалавек ступае
і ў завулку шапку скідае —
цішыць войны там гоіць раны

Маці Божая з Вострай Брамы
і адтуль выходзяць дарогі
на Ашмяны на Ліду на Гродна
на надзею на міласць на веру
Краю нашаму і чалавеку —
як на Небе так на Зямлі
Маці Божая абарані!

Кожны, хто хаця б адзін раз пераязджаў праз Шчыты, мусіў звярнуць увагу на чароўную драўляную царкоўку ды на фігуру святога Яна Непамука побач храма.

Першыя звесткі аб Шчытах паходзяць з XVI ст. Аднак здаецца, што жыццё тут квітнела нашмат стагоддзяў раней. Могуць пра тое сведчыць сярэднявечныя могілкі, якія знаходзяцца непадалёк. Назва вёскі выводзіцца праўдападобна ад баярскага роду Шчытовічаў, да якіх належала яна ў 1520 г.

У XVIII ст. маёмасць купіў Ян Клеменс Браніцкі, які ўстанавіў тут уніяцкую царкву, а таксама прывёз статую св. Яна Непамука, выкананую Хрысціянам Рэдлерам. У 1780-я гады Браніцкі перадаў Шчыты камергеру свайго двара, надворнаму падкаморaму Яну Вянгерскаму.

У 1785 г. устанавіў ён царкву Усячэння галавы св. Іаана Хрысціцеля, якая стаіць па сённяшні дзень.

Перад смерцю Вянгерскі ўсынавіў свайго кузена Антонія Вавёрскага, якому перапісаў усю сваю маёмасць. Род Вавёрскіх звязаны са Шчытамі звыш 200 гадоў, аж па сённяшні дзень.

У пачатку XIX стагоддзя Антоні Вавёрскі збудаваў у другой частцы Шчытоў, названай потым Навадворамі, новую сядзібу, якая захавалася па сённяшні дзень. Праўдападобна, існуючы тады стары двор згаданага камергера Вянгерскага аказаўся недастатковым.

У час падзелу зямлі паміж сынамі Вавёрскага, на мяжы палёў, над ракой Арлянкай, паставілі мураваную каплічку, якая стаіць па сённяшні дзень. Яна бачна з шашы Бельск — Гайнаўка.

Сярод мясцовых жыхароў кружаць многія легенды, звязаныя з гэтым месцам. Адна з іх расказвае аб мужыку Грыдзу і яго жонцы Еўфрасінні, якая вельмі спадабалася мясцоваму дзедзічу. У час, калі Грыдз быў у царскім войску, пан прабраўся да Еўфрасінні і знясіліў яе. Калі муж вярнуўся дадому, убачыў сваю жонку пры калысцы. Даведаўшыся аб тым, што здарылася, забіў ён пана, а яго самога арыштавалі. У месцы, дзе Грыдз забіў дзедзіча, паставілі каплічку. Падобных аповесцей кружыць па ваколіцы даволі многа.

У 1839 г. узнікнуў канфлікт вакол фігуры св. Яна Непамука, якую мелі забраць у бельскі касцёл. Жыхары Шчытоў збунтаваліся. Завязалася бойка, у выніку якой пацярпела фігура. Жыхарам вёскі ўдалося яе затрымаць у сябе. Гэта якраз яна стаіць каля царквы па сённяшні дзень.

Міхась СЦЕПАНЮК

Беларуска з кацянятамі

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

— Ева, табе падабаецца быць „беларускай"?

— Супер!

— Скажы нам больш.

— Як беларуска я больш цікавая для самой сябе.

У Евы Валкавыцкай добрае вока. Яна, дарэчы, вучыцца ў беластоцкім ліцэі № 7, вядомым з-за фатаграфічнага ўхілу. Мы сустракаемся на мастацкай выстаўцы ў галерэі „Сподкі" — на вернісажы Кацярыны Валкавыцкай пад загалоўкам: *Жанчыны і каты*.

Сярод дам з катамі бачым прадстаўніц многіх народаў: індуску, яўрэйку, чачэнку, цыганку, татарку і беларуску.

Пані Кася — мама Еўкі. Яе „беларуска" паказана з няхітрай мацярынскай пяшчотай. Мадэль ідэальна адлюстроўвае і папаўняе ідэю цыкла. Тут кожная дзяўчына-жанчына прамаўляе сваімі „катамі". У беларускі-Еўкі ў руках кацяняты-гарэзы. З вострымі кіпцікамі, вясёлымі вачыма. Хоць яны непаседы і капрызы, іх хочацца паласкаць, прыгарнуць да сябе. Тую нявіннасць і безабароннасць бачым у блакітных, добрых вачах мадэлі. Еўка, як тыя кацяняткі, уяўляе сабой дабрыню і шчырасць.

Менавіта, беларусы — народ шчыры і добры. Яны, як дзеці, думаюць пра прадстаўнікоў іншых народаў з сімпатыяй, са здаровай цікавасцю.

Стоячы ля карціны „Беларуска" я падумала: не трэба вялікіх слоў, каб выказаць сваю любоў да іншых народаў. Дастаткова ўявіць, што наша любімая дачушка ці сынок можа выглядаць як прадстаўнікі гэтых народаў!

ЗОРКА

Вавёрка і воўк

Воўк ляжаў пад елкаю і спаў. Вавёрка скакала з елкі на елку і звалілася на ваўка. Воўк схамянуўся і хацеў яе з'есці. Вавёрка пачала прасіцца: „Пусці мяне". Воўк сказаў: „Добра. Я пушчу цябе, толькі ты скажы мне, чаму вы, вавёркі, заўсёды такія вясёлыя. Мне вось маркотна, а вы гуляеце ды скачаце". Вавёрка адказала: „Уперад пусці мяне на дрэва, дык тады скажу, а то я цябе баюся". Воўк быў негалодны і пусціў.

Вавёрка ўскочыла на галінку і адтуль сказала: „Табе затым маркотна, што ты злосны. Табе злосць сэрца паліць. А мы таму вясёлыя, што нам ніколі не хочацца благога рабіць".

Аляксандра СМОЛІЧ
(паводле Льва Талстога)

Міра Лукша

Караед з Корніна

Стары караед
Угрызся ў кару,
Ў карычневым фраку
Паўзе ён угару.

— Хто тут дармаед?! —
Крычыць на „тук-тук!" —
Не дарма грызу
Я старую кару,
Бурую ў кары
Крывы калідор!
А брыдка гаворыць
Пра мяне ўвесь бор!

Музыка з кайфам

Час на нас! — „The Toobes"

Гэтых маладых прыгожых хлопцаў яшчэ я не чула ўжывую, але мела нагоду паслухаць іх канцэртныя запісы. Гэта такі напарстак сцэнічных уражанняў. А якое асноўнае ўражанне? „The Toobes" іграюць без комплексаў! Можа нехта паставіць мне закід чаму пішу пра гурт, які спявае на англійскай мове, але гэта ж гурт з Беларусі, з Мінска. Думаю, што час ад часу варта пісаць пра тое, якім шляхам ідуць маладыя мінчукі.

Гурт узнік не так даўно, бо летам 2007 года, і за гэтыя два гады шмат чаго ўжо дасягнуў. У мінулым годзе перамог ён у рамках музычнага беларуска-шведскага праекта „Bandscan", дзякуючы чаму адбылі міні-тур па Швецыі. За час свайго існавання, як заўважаюць самі члены гурту, дабіваліся перш за ўсё сваёй уласнай публікі. Зараз можна сказаць, што атрымалася паспяхова, бо на канцэрты гурту прыходзіць шмат народу. Можа таму, што яны адкінулі старадаўнюю попрок стылістыку, з якой знітаваны нашы беларускамоўныя класікі. Яны, заглядзеўшыся на Захад, прынялі той напрамак, у якім рэалізуюць сваю цікаўнасць да музыкі ды адчуваюць сябе лёгка і беспраблемна. Англійская мова, як не дзіўна, можа ім дапамагчы прамаваць сваю музычную гульню па інтэрнэце з надзеяй на большы поспех, бо англійская мова, калі ідзе пра музыку, усё ж такі лічыцца самай папулярнай у свеце. А выбіраючы такую, а не іншую кампіляцыю жанраў (рок-фанк-панк), „The Toobes" стараюцца паспяваць са змнамі не толькі ў амерыканскіх гаражах, а і на вялікіх сцэнах. Ведаюць таксама дакладна, што трэба рабіць, каб здабыць папулярнасць: добрыя, цікавыя здымкі гурту, кліпы, канцэртныя запісы і, урэшце, альбомы. Першы з іх з'явіўся ў гэтым годзе, але, што варта падкрэсліць, матэрыял хлопцы зводзілі самі, а гітарыст, Косця, сам рыхтаваў запіс да афіцыйнай прэм'еры, без дарагіх студыяў, незалежна. Можа гэта не заўсёды добры выхад, калі глядзець на якасць гуку, але напэўна добры варыянт для дэбютантаў, якім у будучыні напэўна паспрыяе шчасце, знойдзецца выдавецтва і прафесійная студыя.

i_basovka@o2.pl

Якуб Колас

Адлёт жураўлёў

Белыя валокны
Сцелюцца над домам.
Не спяваюць птушкі,
Сціхнуў лесу шолам.
Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі.
У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі на вырай
Мкнуцца над лясочкам.

Польска-беларуская крыжаванка № 41

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 37:

Вадалей, горад, зорка, Ян, паўза. Воз, карона, дар, адказ, айчына.



Музычны Збуч

Аляксей МАРОЗ

Збуч быў расспяванай і музыкальнай вёскай. Цяпер гэтыя традыцыі падтрымлівае калектыў „Збучанкі", які пастаянна спявае на фальклорных мерапрыемствах у Музеі малой айчыны ў Студзіводах, часта прэзентуе песні з Гайнаўшчыны на гмінных мерапрыемствах, ахвотна выступае з мясцовым фальклорам на аглядах беларускай песні і іншых беларускіх мерапрыемствах. Яшчэ нядаўна з беларускім калектывам Гайнаўскага дома культуры выступаў вядомы скрыпач Пётр Юшкевіч са Збуча. Зараз яму за дзевяноста гадоў і, на жаль, ужо не можа зайграць на сваёй улюбёнай скрыпцы. У сямідзесятых гадах у Збучы заснаваўся вакальна-інструментальны калектыў, у якім між іншым выступалі кіраўнік сённяшніх „Збучанак" і іх саліст Кацярына Ціханюк ды скрыпач Пётр Юшкевіч. Маладыя жанчыны спявалі ў гэтым калектыве пад акампанемент інструментаў. Выступалі яны тады на вясковых мерапрыемствах, беларускіх аглядах і фэстах, але, на жаль, гэты гурт доўга не дзейнічаў. Жанчыны са Збуча аднавілі вакальныя традыцыі, заснаваючы ў 1995 годзе калектыў, які пазней назвалі „Збучанкамі". Гэтым калектывам і яго рэпертуарам, абапёртым перад усім на аўтэнтычныя фальклорныя песні, зацікавіўся старшыня аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах" Дарафей Фіёнік, які стаў запісваць даўнія збуцкія песні. Калі „Збучанкі" з 2004 года сталі выступаць на студзіводскіх фестывалях, даўнія песні ў іх выкананні паявіліся на дзвюх кружэлках з фестывалю „Там по маёвуй росі". Ідэя выдаць кампакт-дыск калектыву паявілася ў 2008 годзе, а нядаўна яна ажыццявілася ў выглядзе дыска „Моя матуля пэрэборнічка. Музычная культура вёскі Збуч".

— Задума кампакт-дыска, прысвечанага збуцкай музычнай культуры, паявілася пасля маёй пабыўкі ў Пятра Юшкевіча ў 2008 годзе. Спадар Пётр Юшкевіч паказаў тады касеты з аматарскімі запісамі ягонай ігры на скрыпцы і ігры на акардэоне Уладзіміра Мураўскага з Орлі. Гэтыя запісы так мяне захапілі, што ўзнікла прага падзяліцца імі з іншымі, — заяўляе Дарафей Фіёнік.

На выдадзеным кампакт-дыску змешчаны архіўныя запісы танцавальнай музыкі, якая выконвалася на даўніх вяселлях і забавах. Такую музыку іграюць, між іншым, Пётр Юшкевіч (скрыпка) і яго ўнук Ірыней Пшыходскі (гітара). Музычныя здольнасці сям'і Юшкевічаў працягваюцца. Яго ўнукі Ірэк і Марыёля былі ў ліку стваральнікаў славутага калектыву „Дубіны". Калі я наведаў Пятра Юшкевіча, успамінаў ён мне таксама аб іншых музычна таленавітых унуках. У яго пакоі знаходзіліся дзве гітары і скрыпка. Пры мне ўзяў ён улюбёную скрыпку і яшчэ зайграў.

— Пасля вайны я іграў на скрыпцы з арлянскім гарманістам Уладзімірам Мураўскім. Найчасцей нас наймалі ў Збучы, Кляшчэлях і Шчытах, — сказаў Пётр Юшкевіч. — Я ніколі раней і не падумаў, што мае пальцы страцяць сваю ўмеласць. Ужо рукі не працуюць як трэба і пальцы дзеравянеюць.

— Акардэаніст Мураўскі часта бываў у Збучы на розных мерапрыемствах, а пасля наведваў Пятра дома, — гаварыла Аляксандра Куптэль з калектыву „Збучанкі", якая з дзяцінства выхоўвалася ў Збучы.

Фота Аляксея МАРОЗА

„Збучанкі" ў поўным складзе

На дыску запісаны два старыя вальсы, якія Пётр Юшкевіч іграе на сяміструннай гітары, і полька выкананая на балалайцы. Карыстаючыся новым выданнем можна таксама слухаць

Жыхары Збуча на вокладцы новавыдадзенага кампакт-дыска (з гітарай Віктар Юшкевіч, брат Пятра)

музыку ў супольным выкананні Пятра Юшкевіча (скрыпка) і Міколы Сідарука (акардэон) і ў выкананні акардэаніста Уладзіміра Мураўскага. Інструментальная музыка была запісана на звычайным магнітафоне. Цяпер з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі можна было яе падчысціць ад шумаў і падрыхтаваць да выдання.

— На дыску паказваем феномен адной вёскі, дзе людзі іграли на скрыпцы, балалайцы, акардэоне-трохрадцы і гітарах. Умеласці ігры па-народнаму на скрыпцы і трохрадцы адышлі ўжо ў забыццё. Хаця зараз у музычных школах нашы дзеткі вучацца іграць на скрыпцы, гэтая ігра іншая, чым народная. Нават тыя людзі, што і зараз умеюць іграць на акардэоне, не патрапілі б зайграць на трохрадцы. Пашанцавала Мацьку Філіпчуку з Познані, які навучыўся іграць на скрыпцы польскую народную музыку ад народнага польскага скрыпача. Наведваючы Пятра Юшкевіча, ён вельмі высока ацаніў яго ігру на скрыпцы, проста быў ім захоплены, — гаворыць Дарафей Фіёнік. — Вельмі важна, што на кампакт-дыску інструментальную музыку мы можам пачуць з першых рук, у выкананні людзей, якія іграліі яе на вяселлях ці танцах.

Вялікую частку дыска састаўляе рэпертуар „Збучанак" запісаны ў Студзіводах і пры іншых нагодах. Дарафей Фіёнік наведваў між іншым Кацярыну Ціханюк і іншыя збучанкі і ў іх таксама запісваў даўнія песні.

— На дыску прэзентуем каштоўныя песні, якія, мабыць, сягаюць нават часоў Вялікага Княства Літоўскага. Салістка „Збучанак" Кацярына Ціханюк гэта цуда ў сэнсе колькасці песень, якія яна запамятала. У „Збучанак" вельмі вялікая культура спеву. Жанчыны са Збуча паказваюць як можна культурна спяваць узаемна слухаючы сябе. Цудоўна гучаць іх галасы, якія ўзаемна папаўняюцца, — кажа Дарафей Фіёнік. — На дыску чаргуецца збуцкая музычная культура дваццатага стагоддзя. Песні на ім і рамантычныя, і гумарыстычныя, так як бывала ў час ігры на вясковых бяседах. Шматгалосыя спевы змешчаны паміж традыцыйнай танцавальнай музыкай у выкананні розных інструментаў. Ёсць тут старадаўнія сольныя песні, якія саступаюць месца іграным і спяваным раманам, а пазней можам пачуць гумарыстычныя песні і прыпеўкі. Мы невыпадкова не змяшчалі на дыску абрадавых песень, бо знаходзяцца яны ўжо на нашых фестывальных дысках.

Збуцкі калектыў з сямідзесятых гадоў з Пётрам Юшкевічам і Кацярынай Ціханюк на аглядзе „Беларускай песні" ў Новым Беразове

Пачаткаў дзейнасці збуцкага калектыву трэба шукаць у 1975 годзе, калі сфармавалася група людзей ахвотных спяваць і іграць на музычных інструментах. Складалі яе Канстанцін, Пётр, Васіль і Валянціна Юшкевічы, Кацярына Ціханюк, Кацярына Давідзюк і Ніна Баўтрамюк. Музычным калектывам апекаваўся Аляксандр Лукашук з Гайнаўкі. Па ініцыятыве дырэктара Гміннага асяродка культуры ў Чыжах Юрыя Якімюка з 1995 года музычную традыцыю стаў працягваць у Збучы жаночы калектыў, у якім сталі выступаць Кацярына Ціханюк, Аляксандра Куптэль, Надзея Лабаноўская, Ніна Хворась і Наталля Брук (зараз не спявае). Індывідуальнасцю калектыву „Збучанкі" з'яўляецца Кацярына Ціханюк, якая часта сола выступае з рэпертуарам са сваёй роднай вёскі Навіны (побач Ласінкі). Феноменальная памяць спадарыні Кацярыны дазволіла запісаць многа даўніх песень.

— Я не ведаю, як гэтыя песні паўлазілі мне ў галаву. Сядзяць у ёй і ўсё. Будучы малой, я слухала як мая маці спявала прадучы ці выконваючы іншыя заняткі. Тое, што цяпер пачую, забываю, а старое памятаю, — кажа Кацярына Ціханюк.

— У нашым рэпертуары многа даўніх песень. Частку з іх таксама і я прывезла з Арэшкава, — гаворыць Надзея Лабаноўская.

„Збучанкі" многа разоў выступалі на аглядах „Беларуская песня". Прэзентавалі яны многа абрадавых сцэнак і шмат спявалі на розных фэстах.

— Збучу пашанцавала, калі гаварыць пра народных музычных творцаў, якія яшчэ і сёння могуць пераказваць у песнях маладому пакаленню традыцыйную, незвычайную музычную культуру. У даўнім Збучы былі свае акардэаністы Міхал Карнілюк, Кірыл Магрук, Фёдар Раманюк і Васіль Заброцкі, а таксама бубнар Дзяніс Сапяжынскі. Калі гаварыць пра спевакоў са Збуча, дык яны былі выдатнымі. Маю на ўвазе сям'ю Юшкевічаў, сем'і Арцёма Сапяжынскага, Якуба Сапяжынскага і многіх іншых людзей, — пералічвае Дарафей Фіёнік.

Новы кампакт-дыск „Моя матуля пэрэборнічка. Музычная культура вёскі Збуч" трапіў ужо да спявачак са Збуча і іх сямейнікаў.

— Вельмі добра, што выдалі нашы песні на кружэлцы. Маладыя могуць даведацца як калісь спявалі і іграліі. Дарафей прывозіў плеер і мы пераслухалі частку песень. Мае дзеці з Гайнаўкі слухалі дыск і ён ім падабаецца. Кажуць, што ўмела падабраны нашыя песні і музыка. Дачка мае прывезці плеер, дык паслухаем больш, — кажа Кацярына Ціханюк.

11 кастрычніка ў вясковай святліцы ў Збучы ў 15 гадзін адбудзецца публічная прэзентацыя збуцкай кружэлкі. Будуць выступаць там між іншым „Збучанкі", а на скрыпцы зайграе вядомы народны скрыпач Мацек Філіпчук. У час сустрэчы можна будзе купіць новы кампакт-дыск. Гэта дасканалы падарунак як для маладых людзей, цікавых мінулага, так і для старэйшых асоб, жадаючых успомніць даўнюю музыку.

Шлях да ўзаемнасці

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Два дні, 25 і 26 верасня ў падбеластоцкіх Ігнатках, праходзіла XVI Міжнародная навуковая канферэнцыя з цыкла „Шлях да ўзаемнасці", ладжаная Беларускім грамадска-культурным таварыствам пры падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Рэчы Паспалітай, Падляшскай маршалкоўскай управы, прэзідэнта горада Беластока ды Культурнага цэнтра Рэспублікі Беларусь у Польшчы; канферэнцыя праходзіла пад навуковым наглядам прафесара Міхала Кандрацюка. Мэтай гэтага цыкла, сказаў адкрываючы мерапрыемства старшыня БГКТ Ян Сычэўскі, з'яўляецца навуковае пазнанне праблем беларуска-польскага памежжа; канферэнцыі, якія праводзяцца з 1992 года, апраўдалі сябе.

Удзельніцы канферэнцыі

З першым навуковым дакладам выступіў Аляксандр Карскі з Пецярбурга, праўнук славутага Яўхіма Карскага, які расказаў пра некаторыя вытрымкі з жыцця ягонага прадзеда, якія закраналі сённяшнюю Беласточчыну. Менавіта, у ходзе сваіх даследчыцкіх паездак Яўхім Карскі ў 1896 годзе на тры месяцы спыніўся ў падсакольскай вёсцы Жукі. Чаму менавіта пад Саколку прыехаў славуты вучоны? Бо ў той час загадчыкам сакольскай бальніцы быў доктар Маркевіч, дваюрадны брат ягонай жонкі. Два гады пазней Яўхім Карскі здзейсніў падарожжа м.інш. праз Заблудаў, Жэдню, Гарадок, Кузніцу, у 1901 годзе пабываў у Аўгустоўскім уездзе, а ў 1901 годзе пабываў у Белавежы і Беластоку...

З цікавым дакладам выступіў Сяргей Лукашанец з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які гаварыў пра фармаванне іміджу Беларусі ў замежжы. Сказаў ён, што найважнейшым шляхам фармавання такога іміджу з'яўляюцца гуманітарныя кантакты, якія ў гэтым плане важнейшыя ад эканамічнага супрацоўніцтва. Гуманітарныя кантакты перспектыўна ладзіць шляхам г.зв. культурнай дыпламатыі, якая, пакуль, у Беларусі на другасным плане. У 1990-х гадах культурнае ўздзеянне Беларусі на замежжа абмяжоўвалася да постсавецкай прасторы ды кантактаў з супляменнікамі навонкі яе, а гэта адсякала краіну ад шырэйшага замежжа. Не былі выпрацаваны прыярытэты такой палітыкі, а пакуль на першы план выходзіць тут менавіта Польшча, дзе заснаваны Культурны цэнтр Рэспублікі Беларусь; у Польшчы і Беларусі велізарны гістарычна-культурны пласт супольнасці. Падобных беларускіх устаноў няма ў іншых важных краінах, у першую чаргу ў Расіі, Украіне, Ізраілі ці Аўстраліі. На думку дакладчыка, асабліва Польшча павінна праводзіць прамоцыю Беларусі ў замежжы, бо гэта дае палітычныя дывідэнды, падобныя на тыя, якія атрымала Германія ад прамоцыі Расіі.

Гэтыя даклады і іншыя выступленні адбыліся ў час пленарнага пасяджэння, чарговыя тэмы былі прадстаўлены ў трох тэматычных секцыях, якія працавалі сімультанна: мовазнаўчай, літаратурнай і культурна-гістарычнай. Паколькі мне немагчыма было сімультанна быць у трох месцах, таму, на вялікі жаль, па-за маёй увагай астануцца шматлікія тэмы. У першы дзень я наглядаў за працай культурна-гістарычнай секцыі...

Мікалай Пацярухін з Гродзенскага аблвыканкама прывёў статыстычныя даныя пра пражываючых на Гродзеншчыне палякаў — жыве іх там агулам амаль трыста тысяч, адносна найбольш у Воранаўскім раёне — 85%. Дакладна там прасветлены мясцовыя органы самакіравання, у якіх 674 дэпутаты ад польскага насельніцтва. У вобласці дзейнічаюць чатыры каталіцкія кляштары, у Каталіцкай семінарыі ў Гродне вучацца пяцьдзесят тры семінарысты. У вобласці служаць сто дзевяноста ксяндзоў, у тым ліку пяцьдзесят двух замежных — з Польшчы і Літвы. На пытанне з залы, ці на Гродзеншчыне ёсць праваслаўныя палякі, дакладчык не даў адказу, агаворваючыся толькі, што да польскай нацыянальнасці залічваюць сябе каталікі і пратэстанты.

Алена Сцяпанава з Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта расказала пра асноўныя напрамкі занятасці ваенных асаднікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Асаднікі выводзіліся не толькі з вонкавага, але і з ліку мясцовага насельніцтва. І не толькі з ліку ўдзельнікаў польска-бальшавіцкай вайны, але і з ліку патомкаў удзельнікаў Студзеньскага ды нават Лістападаўскага паўстанняў. Спачатку, калі прышэльцам ставіліся палітычныя мэты, суадносіны паміж аўтахтонамі і асаднікамі былі складаныя і ў выніку такіх абставін асаднікам дазвалялася мець зброю. Але калі ў пачатку 1930-х гадоў асаднікі сталі праводзіць асветніцкую дзейнасць, тыя суадносіны выразна палагаднелі.

Юлія Лупіновіч з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта расказала пра іншую форму асветніцкай дзейнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якую праводзіла Польскае краязнаўчае таварыства. Гэтая арганізацыя заснавала шэраг музеяў, м.інш. у Баранавічах, Слоніме, Ваўкавыску, Лідзе. У часе другой сусветнай вайны частка сабраных гэтымі музеямі экспанатаў прапала, але частка іх захавалася і яны ўвайшлі ў фонды заснаваных на іх месцы савецкіх музеяў. Альфонс Бабовік з Мазурскага навуковага таварыства ў Элку расказаў пра беларускае школьніцтва ў міжваеннай Польшчы. Вячаслаў Швед з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта расказаў пра дзевятнаццацівечны лёс бібліятэк Гродзеншчыны і сабраных у іх кніг. Таццяна Мдзівані з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі расказала пра музычны экуменізм у творчасці Кшыштафа Пэндэрэцкага.

Сяргей Сіткевіч з Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта гаварыў пра крыніцы матэрыялаў наконт польскага падполля ў Беларусі ў час другой сусветнай вайны. Доўгі час гэтая тэма была пад забаронай, згадвалася яна эпізадычна і неаб'ектыўна, а адзінай савецкай крыніцай для яе быў урывак з кнігі загадчыка энкавэдзістаў на Беларусь Лаўрэнція Цанавы пра разгром польскіх груповак, уступіўшых у барацьбу супраць Чырвонай Арміі. Толькі з пачаткам 1990-х гадоў, калі стаў магчымым доступ да савецкіх архіваў, і ў Польшчы паявілася шмат прац прысвечаных гэтай тэме, ёю заняліся і беларускія гісторыкі.

Тэме рытуальных дыялогаў у Беларусі і Польшчы, якія з'яўляюцца адным са структурных элементаў калядна-навагодняга комплексу, быў прысвечаны даклад Валянціны Новак з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У час святкавання першай Куцці (перад Раждествам) гаспадар сядзіць насупраць гаспадыні і пытаецца: „Гаспадыня, ці бачыш ты мяне?" — „Не, не бачу". Тут наступае рытуальнае пажаданне: „Каб жа ты не бачыла свету за гуркамі, капустай..." У сваю чаргу пытаецца гаспадыня: „Ці бачыш ты мяне?" І далей ідзе адпаведнае пажаданне гаспадыні, каб жа гаспадар не бачыў свету за стагамі, снапамі, цапамі, вазамі і г.д. У першую Куццю сыпалі свінням снег у вочы, каб тыя не глядзелі ў чужыя агароды. Не мылі лыжак, а пакідалі брудныя і звязвалі на стале шарсцяной ніткай, каб скаціна не разбягалася. Бурбалкамі з кіпячай вады палівалі авёс і ранкам давалі яго коням, каб былі гладкія, шпаркія і г.д. У шлюбнай варажбе на Гомельшчыне дзеўкі апоўначы абсыпалі калодзезь ільняным семем і тройчы абыходзілі яго. Пасля ішлі на двор, бралі палена і вярталіся дахаты, дзе глядзелі: як палена буз сучкоў, тады муж будзе малады і прыгожы, а калі палена крывое, дык стары будзе і г.д. У беларускай традыцыі адбываецца яшчэ іншае сімвалічнае дзеянне, якое сімвалізуе чаканне добрай ураджайнасці: гаспадыня бярэ качаргу, дакранаецца ёю да гаспадара, а ён імітуе падзенне на лаве. І пажаданне ідзе, каб так падалі і снапы на ніве. Гэта ж ёсць і ў традыцыі палякаў, толькі з іншай спецыфікай — перад вячэрай гаспадар хаваўся за сталом, а затым паказваўся і пытаўся: „Старуха, ты мяне бачыла?" — „Не, не бачыла". „Дай Божа, каб ты мяне цэлы год з-за жыта не бачыла"; гэты прыклад запісаны ў раёне Лап.

Захапленне аўдыторыі выклікала Ева Ласкевіч з Вышэйшай менеджэрскай школы ў Беластоку, якая ў кантэксце галоўнай тэмы канферэнцыі — польска-беларускай дарогі да ўзаемнасці — зачытала даклад на больш глыбінную, асмелюся заўважыць, што на тэму фундаментальную — пра шлях да жаноча-мужчынскай узаемнасці; загаловак даклада: „Белорусские свадебные обряды и обычаи поселка Грудек". Ад сябе заўважу, што таленавітая маладая даследчыца не толькі расказала пра рытуалы сватання, пра пачатак таго шляху, але рытуальна закранула і далейшыя яго дэталі. Мова тут пра характэрную беларускаму фальклору накіраванасць дзеяння ў сімвалічным напрамку, як у прыведзеных раней накіраваных на ўраджай рытуалах. Ролю гэтага напрамку выконвае тут сімвалічны пасёлак Грудек, які, мабыць — як падказвае кантэкст — абазначае агульнавядомы паказчык наўзаемненасці, прыкрыты тэкстыльным грудком; у жаночым варыянце гэта два грудкі, якія так і называюцца — грудзі. Такім чынам дакладчыца, як біблейская Ева, накрывае лексічным фігавым лістком тое ўсенароднае слова, якое акрэслівае фундамент узаемнасці; як добрая гаспадыня рытуальна накрывае белым абрусом святочны стол.

Варта тут згадаць і іншыя даклады, абагульняючыя шляхі да ўзаемнасці. Энгельс Дарашэвіч з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта гаварыў пра неабходную для ўзаемнасці раздвоенасць свету. Марыя Навацкая з Універсітэта ў Беластоку гаварыла пра прынцыпы ўзаемнасці, распрацаваныя Джозефам Флетчэрам, а Эмілія Саўко зачытала нават трынаццаты раздзел з Першага паслання апостала Паўла карынфянам — пра тэалагічныя асновы ўзаемнасці...

Заглянуў я і на палетак мовазнаўчай секцыі. Захапіў мяне даклад Лілі Цітко з Універсітэта ў Беластоку пра паходжанне найменаванняў вуліц у падляшскіх гарадах, м.інш. у Нарве, Бельску, Крынках, Кнышыне, Аўгустове, Беластоку. Тэрэса Плюскота з Універсітэта Казіміра Вялікага ў Быдгашчы, гаворачы пра эвалюцыю белавежскіх імён, спаслалася на працы нашага супрацоўніка Пятра Байко. Станіслаў Янушкевіч з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта і Іван Лучыц-Федарэц з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта вельмі змястоўна расказалі пра вытокі назваў мясцовасцей і месц, якія паўсюдна сустракаюцца па абодвух баках цяперашняй польска-беларускай граніцы...

За час канферэнцыі ў мовазнаўчай секцыі былі зачытаны дваццаць чатыры даклады, а ў гістарычна-культурнай дзевятнаццаць. Менш мажорна было ў літаратурнай секцыі, а гэта Святлана Мусіенка з Гродна патлумачыла агульным падзеннем зацікаўлення літаратурай у Беларусі. Гэта ўспрымаю як дакор і ў мой бок...

Падводзячы вынікі канферэнцыі старшыня БГКТ Ян Сычэўскі паведаміў, што прыняло ў ёй удзел больш за пятнаццаць прафесараў. Гэта была першая канферэнцыя з высокім прадстаўніцтвам акадэмій навук з Беларусі, Варшавы і Кракава. Прамоўца падкрэсліў істотнасць дакладаў прысвечаных прамінаючай традыцыі, у якой можна знайсці многа вартаснага.

І я пахвалю арганізатараў за размах мерапрыемства, за падбор тэматыкі і дакладчыкаў. Усе выступленні, якія я меў гонар слухаць, былі вельмі змястоўныя. Дарэчы, вынікі працы канферэнцыі будуць да канца бягучага года выдадзены асобным друкам.

Самае дзікае ў свеце балота?

Белавежская пушча. Хто ўнёс найбольшы ўклад у яе захаванне? Кіеўскія ці літоўскія князі? Польскія каралі ці рускія цары? Генеральныя сакратары ці генеральныя дырэктары? Прыродаахоўныя законы ці ідэалы мастацкіх твораў? Палітыкі ці пісьменнікі? Навукоўцы ці мастакі? Хто?

Калі перавесці названы сэнсавы шэраг са сферы эмацыйна-палітычнай у сферу лагічную, прыземленую, то адказ на пастаўленае пытанне на дзіва просты — балоты. Так-так, менавіта балоты Белавежскай пушчы ва ўсе часы, у любыя гістарычныя перыяды былі і застаюцца яе сапраўднымі ахоўнікамі.

Выконваючы ў прыродзе разнастайныя функцыі — акумулятыўную, біялагічную, гідралагічную, геахімічную, кліматычную, міжкругаваротную, газарэгулятарную, балоты на працягу стагоддзяў ігралі вядучую ролю ў падтрыманні і захаванні стабільнасці экалагічнай сістэмы Белавежскай пушчы і падобных лясных масіваў, у захаванні біялагічнай разнастайнасці відаў.

Калісьці цудоўныя каралі гэтых унікальных біясферных утварэнняў акаляў старажытны рэліктавы лес, агароджваючы ад празмернай гаспадарчай актыўнасці. У цяжкапраходных забалочаных месцах здолела знайсці прытулак і выжыць нават самае буйное млекакормячае Еўропы — зубр.

Але часы змяняліся. Бульдозерная меліярацыя не абышла бокам і гэты ўнікальны куток жывой прыроды. Больш за 2 тыс. га забалочаных тэрыторый было асушана непасрэдна ў Белавежскай пушчы, акрамя таго — зведзеныя на нішто амаль усе прылеглыя да лясного масіву забалочаныя раёны. Толькі па шчаслівай выпадковасці адносна ацалела ўнікальнае балота Дзікое, якое і па сёння працягвае служыць „зыбкім" (у прамым і пераносным сэнсе) гарантам экалагічнага выжывання не меней унікальнага прыроднага ландшафту пад назвай „Белавежская пушча". Прайшоўшы доўгі працэс эвалюцыі, менавіта балоты калісьці сталі калыскай пушчы.

Чым жа яно цікавае, балота Дзікое?

Такіх балотаў, як Дзікое, у свеце толькі чатыры. Яно з'яўляецца адным з найбуйнейшых у Еўропе нізінных балотаў мезатрофнага тыпу, якія захаваліся ў блізкім да натуральнага стане. Размешчана на водападзеле Балтыйскага і Чорнага мораў — гэтым, у тым ліку, і тлумачыцца яго выключнасць. Дзікое — равеснік егіпецкіх пірамід. Узрост складае крыху больш за 6 тыс. гадоў. Такім чынам, калі нарадзіўся Ісус Хрыстос, балота Дзікое было ўжо ў старых гадах. Пэўна, таму яно і захоўвае арэол таямнічасці і каларыт першабытнай дзікай прыроды.

Тэрыторыя балота Дзікое — адзін з нешматлікіх прыродных аб'ектаў сучаснасці, вартых уключэння ў спіс Сусветнай спадчыны.

Нашы беларускія балоты можна назваць „лёгкімі" ўсёй Еўропы, а таксама фактарам, які стрымлівае парніковы эфект. Навукоўцы падлічылі, што адзін гектар „мокрага" балота ў 7-8 разоў эфектыўней забірае вуглякіслы газ з атмасферы, чым зялёны лес такой жа плошчы. Такім чынам, неасушаныя балоты ў значнай ступені ўзбагачаюць атмасферу кіслародам. Здольнасць акумуляваць кісларод узрастае па меры нарастання тарфяных пакладаў, што адбываецца дзякуючы высокай водаўтрымліваемай ёмістасці торфу, прыкладна ў пяць разоў большай у параўнанні з сухой масай.

Балоты з'яўляюцца важным кампанентам рэгуляцыі мясцовага клімату: неасушаны тарфяны паклад добра праводзіць цяпло, здольны хутка акумуляваць яго і гэтак жа хутка перадаваць навакольнаму асяроддзю, увільгатняць паветра. У халодныя і гарачыя перыяды неасушаныя балоты супрацьстаяць перагрэвам і пераахаладжэнням паветра, засухам, змякчаюць мікраклімат. І поўная супрацьлегласць — асушаныя балоты значна губляюць пералічаныя здольнасці і якасці. Атмасферныя засухі, позневесняныя і раннявосеньскія замаразкі — нязменныя спадарожнікі асушаных тарфянішчаў, меліяраваных балотаў.

Але вернемся да нашага пушчанскага балота. Дзікое на працягу доўгага перыяду свайго існавання адрознівалася высокай ступенню наземнай біялагічнай разнастайнасці. Напрыклад, сёння пералік пазваночных, што жывуць у гэтым раёне, уключае 28 відаў млекакормячых, 99 відаў птушак, чатыры віды рэптылій і пяць відаў амфібій. У Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь занесена 14 відаў птушак, два віды млекакормячых, 13 відаў насякомых і 14 відаў раслін. І што асабліва характэрна: на прасторах балота Дзікое сустракаецца воўк, часам заходзіць рысь, а балотныя ўскраіны аблюбаваў цар звяроў зубр.

Сапраўднай сенсацыяй апошніх гадоў стала з'яўленне ў дадзенай мясцовасці (у раёне вёскі Клепачы) бурага мядзведзя. А гэты ж драпежнік быў знішчаны ў Белавежскай пушчы яшчэ ў XIX ст.! На жаль, спробы рэінтрадукаваць папуляцыю гэтага звера ў 1930-1940 гг. не ўвянчаліся поспехам. А вось абарыгены-камары, вечныя назойлівыя спадарожнікі вільготных забалочаных нізін, выдатна пачуваюцца...

Балота Дзікое — унікальная прыродная тэрыторыя, якая здолела стаць камфортным асяроддзем для рэдкіх відаў арнітафаўны. Тут знайшлі пастаянны прытулак і пракорм такія знікаючыя экземпляры, як вяртлявая чаротаўка, якая лічыцца ва ўсім свеце глабальна пагражальным відам. Тое ж самае можна сказаць пра вялікага арляца, чыя папуляцыя з-за празмернага пераследу амаль паўсюдна знікла. Абодва гэтыя віды занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Мікалай ЧЭРКАС
Грамадскае таварыства „Ахова птушак Бацькаўшчыны"

http://garady.org

Спробы неяк абагульніць веды па гісторыі роднага краю заўсёды вартыя павагі. У Байнэце час ад часу з'яўляюцца рэсурсы, дзе іх аўтары распавядаюць пра гісторыю той ці іншай беларускай мясціны, горада альбо цэлага рэгіёна. У гэтым годзе ў сусветнай павуціне ўзнік сайт, які прэтэндуе на абагульненую і разам з тым сістэматызаваную інфармацыю пра беларускія гарады.

Калі цікаўны карыстальнік інтэрнэта набярэ на сваім камп'ютары адрас http://garady.org, то перад яго вачыма ўзнікне выяўленне, якое на першы погляд падаецца крыху недароблены. На карцінцы няма практычна ніякіх аздабленняў, акрамя назвы сайта і карты Беларусі, дзе пазначана большасць гарадоў краіны. Каб убачыць рубрыкі сайта, трэба крыху пільнасці, бо выйсці на іх напісаныя маленькімі бляклымі літарамі ўнізе ад выяўлення карты.

Дарэчы, вартасці ў гэтых рубрыках нямнога. Найбольш карыснай падаецца „Пошук", дзе месціцца акенца, куды ўносіцца патрэбнае для адшукання слова. Злучаныя з пошукавай сістэмай Google „Гарады Беларусі" адкрываюць вялікую колькасць сайтаў з патрэбным словам ці выразам.

Рубрыка „Аб сайце" не апраўдвае сваёй назвы. Даведацца нешта аб стваральніках рэсурса, што імі рухала, якія мэты і задачы яны перад сабой ставілі — з гэтай рубрыкі немагчыма. Адзінае, што там ёсць — выйсці на англійскую і рускую версіі сайта.

Найбольш карыснай з цэлага партала падаецца карта Беларусі, бо ўсе назвы гарадоў, якія згодна геаграфічнай рэчаіснасці размешчаны на ёй, з'яўляюцца гіперспасылкамі. Таму, калі нас зацікавіць той ці іншы горад з пазначаных на карце, то, клікнуўшы на яго, мы атрымаем магчымасць пазнаёміцца з больш-менш поўнай інфармацыяй аб ім.

Такая „геаграфічная" падача гіперспасылак сапраўды вельмі зручная, напрыклад, для тых, хто плануе праехаць па нейкім маршруце, зазірнуўшы ў гарады, што выклікаюць найбольшае зацікаўленне.

Прыемнае ўражанне ад віртуальнага наведвання гарадоў пакідаюць фотаздымкі, якія арганічна і ўдала дапаўняюць тэксты. Праўда, не да кожнага тэксту аўтары сайта яшчэ паспелі размясціць такое візуальнае дапаўненне. Але такі недахоп лёгка выправіць, калі паўсядзённа займацца сайтам.

На жаль, уладальнікі сайта, размяшчаючы інфармацыю аб гарадах, дазволілі сабе дапусціць некаторыя памылкі. Так, праз Гарадок, што на Віцебшчыне, яны „пусцілі" чыгунку на неіснуючы ўжо горад Ленінград. У Магілёве яны „пабудавалі" насупраць старога гарадзішча Змееўка ніколі не існаваўшую 13-павярховую гасцініцу „Дняпроўская".

Варта адзначыць, што рускамоўная версія сайта на даным этапе больш распрацаваная чым беларуская. Там можна даведацца пра вёскі раёна таго ці іншага горада, пазнаёміцца з геральдыкай і нават пабачыць падрабязную карту з указаннем бліжэйшых населеных пунктаў.

Падобная падрабязная інфармацыя, за выключэннем карт, размешчаная і на англамоўнай версіі. З чаго закрадваецца думка, што аўтары сайта больш арыентавалі яго на неваладаючых беларускай мовай людзей. Калі гэта сапраўды так, то гэта іх галоўная памылка — грэбаванне роднай мовай не ўпрыгожвае аніякага сайта.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

На трох франтах

З мінулага тыдня беларускія заўзятары хакея будуць пільна сачыць ажно за трыма турнірамі. Услед за Кантынентальнай хакейнай лігай і адкрытым чэмпіянатам Беларусі стартаваў і 92-і ў гісторыі розыгрыш заакіянскай Нацыянальнай хакейнай лігі. Увагу айчынных аматараў папулярнай гульні ў мацнейшай лізе свету будуць прыцягваць найперш клубы, у якіх выступаюць нашы легіянеры. Іх дэсант за міжсезонне не павялічыўся, а нават паменшыўся. Былі шанцы трапіць у эліту ў Міхаіла Стэфановіча і Сяргея Коласава, аднак пакуль ім давядзецца гуляць у ніжэйшым рангам дывізіёне. А кіраўніцтва „Манрэаль Канадыенс" пастанавіла адправіць у фарм-клуб форварда Сяргея Касціцына. Сам нападнік рашуча запярэчыў такой пастаноўцы пытання, адмовіўся перабірацца ў АХЛ і ў выніку зараз папросту дыскваліфікаваны. Касціцын-малодшы патрабуе абмену ў іншы клуб. У кожным разе гуляць яму зараз у НХЛ не дазволяць — чакае альбо паніжэнне, альбо пераезд у КХЛ, альбо прастой.

Усе шанцы стаць лідарам свайго „Таронта" мае Міхаіл Грабоўскі, які напэўна будзе імкнуцца пабіць асабісты рэкорд выніковасці. Пра гэта сведчаць яго тры ачкі ў стартавых двух матчах. Нацэльваецца на вядучыя ролі і Андрэй Касціцын у год сотых угодкаў „Манрэалю", пакуль жа гэты нападнік валодае сярод беларусаў бамбардырскім рэкордам за сезон па сістэме гол плюс пас. Не перастае прыемна здзіўляць сваім стажам абаронец „Каларада" Руслан Салей, у якога апошні кантрактны год з „лавінамі". Салей разам з Адамам Футам з'яўляюцца зараз галоўнымі аксакаламі „Каларада" і пастараюцца выцягнуць клуб з ямы, у якую ён трапіў летась.

Што датычыць агульнага, то назіраецца пэўная тэндэнцыя адтоку гульцоў з НХЛ у КХЛ, дзе таксама круцяцца „шалёныя" грошы. Цэлы атрад прафесіяналаў падаўся на расейскі „нафта-газавы" хлеб: Сяргей Фёдараў, Віле Пелтанен, Марцін Гербер, Сяргей Зубаў, Іржы Гудлер ды іншыя вярнуліся з-за акіяна ў Еўразію. Выступ мінскага „Дынама" ў КХЛ выклікае сёлета пераважна раздражненне. Абвешчаная не так даўно палітыка пад дэвізам „«Дынама» — базавы клуб зборнай" насамрэч сталася прафанацыяй і фікцыяй. Беларускіх гульцоў у стане бела-блакітных можна пералічыць па пальцах адной рукі, бальшыню месцаў у складзе займаюць легіянеры. Больш таго, гульцы зборнай перыядычна ссылаюцца ў фарм-клуб — салігорскі „Шахцёр". Гэта выглядае тым больш дзіўна, што на капітанскім мосціку „Дынама" стаіць канадыец Глен Хэнлан — настаўнік менавіта беларускай зборнай. Сам выступ „Дынама" выглядае досыць блякла — каманда дэманструе невідовішчны абарончы хакей і пляцецца ў хвасце турнірнай табліцы канферэнцыі „Захад".

А тым часам галоўны трэнер чэмпіёна і бясспрэчнага лідара беларускай экстралігі менскага „Юнацтва" Міхаіл Захараў падпісаў пагадненне з украінскай федэрацыяй хакея і стаў сёмым у гісторыі трэнерам на чале нацыянальнай дружыны суседняй краіны. Адкрыты чэмпіянат Беларусі пасля вяртання кіеўскага „Сокала" стаў яшчэ больш цікавым. Украінская каманда ідзе зараз на другім месцы. На трэцюю пазіцыю выбраўся „Гомель", які квола выглядаў на старце, а зараз набраў сапраўдны разгон. Радуе пераважна сваіх прыхільнікаў і гродзенскі „Нёман". Хацелася б, каб у Гродне перасталі знішчаць свае каманды (як прыклад — футбольны „Нёман") і далі спакойна працаваць далей маладому, але перспектыўнаму трэнеру Дзмітрыю Краўчанку, які ўжо стварыў баяздольны калектыў.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Беластоцка-гродзенскі „Акіян”

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Гэта будзе першы такі танцавальны спектакль у Беластоку, зрэалізаваны пад кірункам замежнага харэографа. З Беларусі! Танцоры з „Grupy Przejściowej”, што працуе ад васьмі гадоў у студыі „DanceOffnia” пад вокам гродзенца Дзмітрыя Куракулава, танцора ды знакамітага харэографа і педагога, рыхтуюць сучасны, аўтарскі балет „Ocean”.

Калі мы трапляем на адну з рэпетыцый у студыю „DanceOffnia”, Дзмітрый пад люстравай сцяной са спакоем і ўсмешкай паказвае чацвёрцы маладых людзей (тром дзяўчатам і аднаму хлопцу) чарговыя фігуры будучага спектакля. Тацноры без слоў прымаюць заўвагі, упарта паўтараюць ды паўтараюць, каб кожны з г.зв. сцэнічна-харэаграфічных рысункаў быў як найдасканалы. Раней аднак маэстра вядзе размінку таксама для тых, хто ўдзельнічае ў занятках у іншых групах Студыі (займаюцца яны фрыстайлам, танцам мадэрн і гіп-гопам), што знаходзіцца ў будынку былога оптавага склада амаль насупраць чыгуначнага вакзала. На калідоры сутракаем загадчыцу „Дансоффні” Караліну Гарбацік:

— Мы запрапанавалі якраз Дзмітрыю працу над гэтым мерапрыемствам, таму што ўмела спалучае ён сучасны танец з класічным. Штодзень працуе ён з прафесіяналамі, а тут з выбранай мною шасцёркай нашых танцораў, аматарамі.

Адзначае:

— Праца з прафесіянальным, вонкавым харэоргафам стварае магчымасці іншага погляду на танец.

Адкуль з’явіўся якраз Дзмітрый? Караліна Гарбацік тлумачыць:

— Свет танца вельмі малы. Я шукала харэографа, які паможа нашым танцорам, асабліва заснаванай мною „Grupie Przejściowej”, развівацца яшчэ больш. Аказалася, што наша інструктарка Ірына Сідарук вучылася танца ў гродзенскім ансамблі Дзмітрыя. І вось яна нам яго запрапанавала.

Пасля рэпетыцыі, якая працягвалася пару гадзін, па беларускім харэографе не відаць стомы. Пытаемся, аб чым будзе той „Акіян”:

— Пастараемся паказаць станы акіяна, яго таямнічае і бязмежнае адхланне. Нутро акіяна — гэта паўната ўласнай энергіі, якая, прымаючы розныя формы, безупынна мяшаецца з матэрыяй паветра і зямлі. Хачу паставіць тры пытанні: ці гэтае асяроддзе жыцця нейкіх істот, ці самая ў сабе жывая істота, ці вялікае невядомае, якое чалавек не ў змозе разгадаць?

Як працуецца з беластоцкімі танцорамі, аматарамі?

— Гэта, вядома, не прафесіяналы. Можа, з прафесіяналамі было б лягчэй, але гэтыя маладыя людзі на ляту ловяць усе мае падказкі і можа спектакль не будзе прафесіянальным у акадэмічным сэнсе, але напэўна поўны запалу. Езджу ў Расію і там працую таксама з аматарамі і ёсць у мяне ўжо досвед у гэтым плане.

Саракапяцігадовы Дзмітрый закончыў харэаграфічнае аддзяленне мінскай Акадэміі мастацтваў. Раней на пераломе 80-х і 90-х гадоў, сем гадоў танцаваў у заслужаным і вядомым таксама на Беласточчыне гродзенскім ансамблі песні і танца „Белыя росы”. Чаму пакінуў гэты ансамбль?

— Сем гадоў фальклорнага танца было для мяне дастаткова. Хацеў развівацца і марыў пра сучасны танец.

Дзмітрый у 1991 г. танцаваў у культавым ужо варшаўскім мюзікле „Метро” Януша Юзафовіча і Януша Стаклосы. Вёў у Гродне з 1993 г. Групу сучаснага танца „ТАД”, якая ад 1995 г. дзейнічае пры Гродзенскай філармоніі. Гэта першы прафесійны ансамбль сучаснага тацна ў Беларусі. Займаецца м.інш. блізкімі сэрцу харэографа стылямі танцаў, спалучаючымі contemporary, мадэрн і акрабатыку. Уводзіць навінкі ў пластыку руху пры незвычайным адчуванні музыкі. Мяркуючы па рэпетыцыі, у якой удзельнічала „Ніва”, таксама такую стылістыку будзе відаць у „Акіяне”. Харэограф у гэтым прадстаўленні прымяняе музыку Джона Гопкінса, Міхаіла Карыкіса і Рэбена Тэйлара. Пры нагодзе пытаемся ў Дзмітрыя, як яго група і ўвогуле сучасны танец трактуюцца сёння ў Беларусі:

— З пачатку танец якім займаюся я і група „ТАД” не ўспрымаўся ўсур’ёз, але звыкліся з ім. Давалі мы шмат канцэртаў для дарослых і дзяцей. Гледачы ўспрымалі нас вельмі ветліва. Дайшло да таго, што ў 2006 г. „ТАД” атрымаў спецыяльную ўзнагароду прэзідэнта „ў галіне харэаграфіі за мастацкія здабыткі”.

І гэта не адна ўзнагарода. Сярод іх апынуліся прэстыжныя трохкратныя вылучэнні на Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі ў Віцебску і фестывалі „Свет прыгажосці” ў Маскве (гран-пры). Крытык Святлана Уланоўская два гады таму, паглядзеўшы аднаактавы балет Дзмітрыя „Бывай, паверхня...” напісала: „Дзмірый Куракулаў, якога кампазіцыі сталі ўжо класікай беларускай харэаграфіі ў стылі мадэрн, не задавальняецца дасягненнямі і стараецца сягнуць вышынь харэаграфічнай творчасці, на якіх яшчэ не быў”. Мабыць, чарговай здабытай вяршыняй будзе беластоцкі спектакль.

Невядома яшчэ дзе і дакладна калі адбудзецца прэм’ера „Акіяна”. Найбольш праўдападобна будзе гэта на пераломе лістапада і снежня ў Беластоцкім лялечным тэатры, бо, як кажа Караліна Гарбацік, гэты тэатр стварае камерную атмасферу. Фінансава праект падтрымлівае прэзідэнт Беластока. Што цікава, на днях „DanceOffnia” мае пусціць у рух чарговы праект рэалізаваны студыяй разам з гарадоцкім гуртом „Ilo&Friends” і яго лідаркай Ілонай Карпюк (таксама журналісткай „Нівы” і Радыё Рацыя). Рабочы загаловак: „Тоеснасць”.

Адгаданка



1. града скошанай травы, 2. эфіраносная расліна з горкім смакам, *Artemisia absinthum*, 3. карона, якую трымаюць над галовамі маладых у час вянчання, 4. бык, якога калісь скарыстоўвалі ў сельскагаспадарчых работах, 5. будынак для стаянкі і рамонту лакаматываў і вагонаў, 6. 60 мінут, 7. выспа, 8. сталовая, шынок з таннымі і простымі стравамі, 9. дзікая свіння, 10. дэталь рухавіка ўнутры цыліндра.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — нігерыйская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 36 нумара

Домік, зелень, ніць, труізм.

Рашэнне: **Летні дзень зіму корміць.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Накład: 1 000 egz.

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі (7)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

(пачатак у 33 н-ры)

У рэшце рэшт у Мастаўлянах накіравалі мяне да найбольш заядлага крытыка Каліноўскага, але яшчэ да гэтага я атрымала на радзіме рэвалюцыянера дыдактычную лекцыю. У пачатку вёскі мае „добрыя знаёмыя", якіх я бачыла толькі раз у жыцці, пачалі вучыць розуму:

— Ці вам ужо ў той „Ніве" не хапае нармальных людзей? Навошта вам „насвятляць" таго мяцежніка?

— Вы супраць, каб гаварыць пра вашага ўраджэнца?

— Які ён наш! — у голасе субяседнікаў чулася нотка халоднай дыстанцыі. З выстрыжанага, як авечка ў спякотнае лета, панадворка, луналі пахавыя ноткі грыля, герані, паленай воўны. З пакояў гопала музыка „Прымакоў". Усюды адчувалася задаволенасць, сытасць, парадак, і пагарджаная тут *еўропа*! Бо якраз завіталі з візітам сваякі аж з Эдынбурга!

— У вас жа ж была школа названая яго імем...

— Вы лепш яго не „насвятляйце"! — асцерагалі мяне па-бацькоўску дзядзькі. — Чаму? Бо гэта сабачая антыбеларуская тэма! Лепш памаўчаць.

І прыгадалі пра сустрэчу з мінчукамі, якія прыперліся, як і я, таксама „насвятляць" Каліноўскага: адзін з іх меў спытаць мастаўлянцаў ці ведаюць, што ў іх нарадзіўся вялікі чалавек?! Тут ведалі як адказаць, па сёння паўтараюць і смяюцца ў вёсцы.

Бо сказалі... што ў іх усе нараджаліся маленькімі.

Як вядома, жывая цікавасць нараджаецца ў супярэчнасцях. Пасля ўсіх такіх гутарак мне хацелася яшчэ больш „насвятляць" асобу Вікенція Канстанціна Каліноўскага. Мне нават удалося адшукаць польска-беларускую дошку ў гонар Кастуся, скрадзеную, як меркавалі на месцы, варажэнькамі-іншаверцамі. Праўда паказалася няхітрай і банальнай, але пра гэта ў свой час...

* * *

У пачатку верасня я вярнулася з Вільні, дзе разам з уздзельнікамі З'езду беларусаў Балтыі мы наведалі муры турмы, дзе правёў апошнія дні жыцця Вікенцій Канстанцін Каліноўскі. Будынак пазначаны беларуска-літоўскай табліцай з унушальнай выявай рэвалюцыянера, найбольш падобнай да арыгінала. Вікенцій Канстанцін Каліноўскі, калі прыглядзецца яго партрэтам і скульптурам, чалавек без твару. Ён іншы ў кожным месцы і часе. У рысах віленскага Кастуся кідаецца ў вочы дзікасць яцвяга. Пасля я аж злякалася ад дзіўных падказак інтуіцыі. Віленскі знак павярнуў мяне зноў на сакольска-яцвяжскія сцежкі, канкрэтна ў бок літаратурнай спадчыны Сакрата Яновіча. Пасля падарожжа з Літвы ў мяне асталіся манеты-літы з выявай Пагоні. Грашакі весела пабразгівалі ў кішэні, прасіліся ўвагі. Я час ад часу дакраналася да іх, сціскала ў далоні, ад чаго, як здавалася, святлела ў мазгах, штосьці „насвятлялася". У пэўны момант з манетай у далоні я пайшла да паліцы з кніжкамі і машынальна дастала „Сярэбранага ездака" Сакрата Яновіча. Кніжка пасадзіла мяне ў крэсла! Сакрат Яновіч як ніхто па-нашаму „насветліў" Каліноўскага. Калі ў студэнцкія гады я першы раз прачытала яго аповесць пра Студзеньскае паўстанне (на польскай мове ў перакладзе Анны Сабэцкай), мне хацелася завыць на ўсю нашу пушчу: чаму гэтай кніжкі няма ў ліку школьнай абавязковай літаратуры? Яна як агонь паліць рэлікты паліцыйнай ментальнасці, якой прасякнуты наш вясковы народ.

— Ці вам ужо ў той „Ніве" не хапае нармальных людзей? Навошта вам „насвятляць" таго мяцежніка?

У „Сярэбраным ездаку" паўстанцы — свае людзі: Макарэвічы, Кішкелі, Пракопчыкі, Яновічы... Яны, як індзейцы, перамяшчаюцца толькі сабе вядомымі сцежкамі-тропамі. Пераказ Яновіча разбуджаў прызабытыя ўспаміны старажылаў з майго дзяцінства, з маёй роднай прыпушчанскай вёскі. Памяць пра паўстанцаў захавалася ў нас дзякуючы дзікім балотам паміж Тыневічамі і Даратынкай, дзе хаваліся паўстанцы і мясцовыя рызыканты, якія не хацелі трапіць у рэкруты. Магчыма, з-за апошняй акалічнасці ў нас не вешалі сабак на Каліноўскім і паўстанцах!

* * *

З сённяшняй перспектывы „Сярэбраны яздок" садзіць у крэсла яшчэ з-за аўтабіяграфічных дэталяў пісьменніка, „насветленых" у апошнія гады.

Уражваюць фрагменты, у якіх адлюстраваны акцыі палітычнай паліцыі і справа вярбоўкі ў сышчыкі. Гэтыя фрагменты гучаць як перасцярога і заадно інструкцыя на выпадак няшчасця. Гутарка канспіратараў Уладка Прончыка і лесніка Вільдовіча да болю мужыцка-беларуская. Маладажон Прончык раіцца ў вопытнага аднапляменца і ідэйнага брата што яму рабіць. Хочуць з яго зрабіць шпіёна?! Стары ляснік дае параду, каб перахітрыць палітычную паліцыю:

— Ты павінен быць гатовы на ўсякае. Думкі паліцыі — таемныя ды хітрыя, — засмяяўся Вільдовіч.

— Што мне ў такім выпадку рабіць?

— Уладак, — Вільдовіч падсеўся бліжэй, — будуць пытаць цябе пра паўстанцаў — не пярэч, што не бачыў іх, бо гэтым адразу выклічаш падазрэнні да сваёй асобы... Кажы ім праўду, але такую, каб нікому не зашкодзіць. Перш за ўсё ты пазбягай называць прозвішчаў або дакладных звестак. Ты павінен рабіць уражанне таго чалавека з пачцівай душою, які вельмі мала ведае. Тады, бадай паспрабуюць звербаваць цябе на супрацоўніка, так сказаць, на пробны час. Не адмаўляйся ад тайнага супрацоўніцтва з паліцыяй, згаджайся, але памятай аб адным: не падпісвай, чуеш. Ніякіх паперкаў! Ніякіх! Памятай: згаджайся — і не падпісвай! Найлепшым выйсцем з гэтай сітуацыі, здаецца, будзе рабіць з таго ганаровую справу.

„Добра табе раіць, калі ты не ў маёй скуры" — незнарокам падумалася Прончыку.

(працяг будзе)

Дошка ў гонар Каліноўскага на мурах былой турмы ў Вільні

10.10 — 16.10

(22.03. — 20.04.) Асабліва паспяховы час для пачуццёвых, фінансавых і кампанейскіх спраў. Выклічаш вялікае ўражанне. У каханні ўсё можа быць магчымым. Многа энергіі і добрых ідэй.

(21.04. — 21.05.) Вялікая пераканаўчая сіла. Ідзі ўперад, напэўна дойдзеш да мэты. Асобе, якая цябе падвяла, дай яшчэ адзін шанц. 13-17.10. хтосьці схоча ўвесці цябе ў зман (ён не карыстаецца добрай рэпутацыяй), можаш мець страты.

(22.05. — 22.06.) Магчымыя канфлікты з законам, незавершаныя справы. У каханні чакаюць цябе надта жарсныя перажыванні. У прафесійных справах карыстайся здабыткамі першапраходцаў, падказкамі і падтрымкай асоб, якім даверылі твае знаёмыя.

(23.06. — 23.07.) Будзеш у выдатнай форме. Дзякуючы дыпламатыі і прадпрымальнасці дасягнеш сваіх мэт. У бізнесавых справах гэта іншыя павінны браць з цябе ўзор. Але хутчэй спраўся з прафесійнымі абавязкамі, тым лепш будзе для тваёй кар'еры.

(24.07. — 23.08.) Да 12.10. зрэалізуеш добра свае планы. Твая інтуіцыя цябе не падвядзе. З 15.10. (да 19.10.) палягай на сваіх прадчуваннях, асабліва пры людзях, з якімі плануеш штосьці разам. Калі ведаеш, чаго хочаш — будзеш непераможны!

(24.08. — 23.09.) У партнёрстве пастаў на шчырасць — гэта прынясе знакамітыя рэзультаты. Пазбягай старых сходжаных сцежак. На працы рашыся на наватарскія выхады. Не катуй сябе дыетамі. Духова таксама можаш дазволіць на пасмакаванне ўсяго.

(24.09. — 23.10.) Знакаміта падбярэш сабе кампанію, правядзеш з ёю мілы час. 13-17.10. асоба, якую ты ведаеш з мінулага, можа выцягнуць на святло тое, што табе лепш было б схаваць (схоча цябе скампраметаваць). Асабліва 10. і 11.10. не перакроч мяжы прыстойнага густу.

(24.10. — 22.11.) Гарантуеш сваім родным пачуццё бяспекі і фінансавай стабільнасці. Старайся не падпарадкоўваць сабе партнёра і не быць зайздросным. У хвіліну слабасці разлічвай на сяброў. Да 17.10. выканай неабходныя працэдуры.

(23.11. — 22.12.) Да 12.10. ты „народжаны ў кашульцы". Да 13.10. будзеш натужліва раздумваць, ці не выбрацца за мяжу. У гэтым месяцы ўдасца табе зрэалізаваць свае найбольшы мары — будзе ён адным з найлепшых у кожным плане.

(23.12. — 20.01.) 10-14.10. ты вельмі моцны і з поспехам можаш брацца за найцяжэйшае. Калі нават заробіш казачныя сумы, не ашчадзіш. З 15.10. (да 19.10.) не ангажуйся ў супольны бізнес з сябрам і не пазычай яму грошай.

(21.01. — 19.02.) Калі працуеш з партнёрам, пачнеце сапернічаць. Абміне цябе не толькі сум, але і хвароба. Добры настрой. Шэф дазволіць табе папрацаваць па-твойму. Большыя выдаткі кансультуй з блізкімі.

(20.02. — 21.03.) Будзеш адважны, аж занадта. Будзеш схільны закахацца ў асобу, якую бачыў два разы ў жыцці. Досыць спакойны час. Міла і гарманічна ў хаце, адно цяжка звыкнуць з тым, што дзеці растуць і хочуць быць незалежнымі. Не бойся марыць: найсмачнейшыя плады растуць высока!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960